4 ДНІ
ЗАСТАЛОСЯ ДА ВЫБАРАЎ ПРЭЗІДЭНТА
Твой голас важны для Беларусі!

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на роднай мове
ЗВЯЗДА
7 КАСТРЫЧНІКА 2015 г. СЕРАДА № 192 (28050) Кошт 2000 рублёў
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# ДАРОГІ, ЯКІЯ МЫ СТВАРАЕМ

## Учора пры ўдзеле кіраўніка дзяржавы адкрыўся ўчастак другой кальцавой аўтадарогі вакол Мінска

**Агульная працягласць новай кальцавой аўтадарогі вакол Мінска складзе каля 159 км. Асаблівасцю яе будаўніцтва з'яўляецца шырокае прымяненне цэментабетону для стварэння пакрыцця, што з улікам разліковых затрат за міжрамонтны перыяд будзе больш эканамічна ў параўнанні з асфальтабетонам.**



Фота БЕЛТА.

Як далажылі Прэзідэнту, другую кальцавую аўтадарогу прапануецца не забудоўваць аб'ектамі прыдарожнай інфраструктуры. Аляксандр Лукашэнка лічыць гэтую прапанову разумнай. «У нас праз кожныя 40-50 км па любой трасе добрыя населеныя пункты, раённыя цэнтры», — звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы, адзначыўшы, што менавіта там, дзе ёсць людзі, інфраструктура, трэба будаваць падобныя аб'екты. На думку кіраўніка дзяржавы, гэта пасадзейнічае развіццю раённых цэнтраў і іншых пасёлкаў, якія знаходзяцца паблізу трасы.



Аляксандр Лукашэнка супраць ушчыльнення Мінска і лічыць, што трэба будаваць больш жылля і інфраструктуры за МКАД. На яго думку, недзе нешта ў Мінску можна дабудаваць у якасці ўшчыльнення, але захапляцца не трэба. «За кальцавой дарогай (у раёне Заслаўя, Радашковіч, Жодзіна, Смалявіч, Рудзенска, Фаніпаля, Дзяржынска) — шмат месцаў, дзе можна будаваць жыллё і іншыя аб'екты», — звярнуў увагу Прэзідэнт. Паралельна неабходна ўдасканальваць сістэму зносін, дапаўняючы аўтатранспартныя шляхі чыгуначнымі, дадаў кіраўнік дзяржавы. «Гэта будзе зручна, і мы не перанасыцім Мінск», — сказаў ён, яшчэ раз падкрэсліўшы, што жыллё ў сталіцы неабходна будаваць па мінімуме.

Як паведамляе прэс-служба Прэзідэнта, кіраўніка дзяржавы праінфармавалі аб выкананні яго даручэнняў па будаўніцтве другой кальцавой аўтадарогі і перспектывах транспартнай інфраструктуры Беларусі, уключаючы аўтамабільны і чыгуначны транспарт. Будаўніцтва другой кальцавой ідзе ў два этапы. Першы павінен быць завершаны да 1 студзеня 2016 года. Да гэтага часу будзе здадзены ўчастак аўтадарогі М3 Мінск — Віцебск да аўтадарогі М6 / Е28 Мінск — Гродна — мяжа Польшчы (Брузгі). Другі этап будаўніцтва, як плануецца, завершыцца ў 2017 годзе на ўчастку ад аўтамабільнай дарогі М6 / Е28 Мінск — Гродна — мяжа Польшчы (Брузгі) да аўтамабільнай дарогі М1 / Е30 Брэст «Казловічы» — Мінск — мяжа Расіі (Рэдзькі).

Прэзідэнт лічыць своечасовым будаўніцтва другой кальцавой аўтадарогі, паколькі гэта дапаможа разгрузіць галоўныя магістралі Мінска. Пры гэтым важна, што выкарыстоўваюцца айчынныя матэрыялы, што робіць больш танным працэс, дадаў ён. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што другая кальцавая павінна стаць узорам дарожнага будаўніцтва.

Пасля цырымоніі адкрыцця Прэзідэнт зрабіў азнаямленчую паездку па ўчастку другой кальцавой, які адкрыўся. Кіраўнік дзяржавы пагутарыў таксама з прадстаўнікамі працоўных калектываў дарожна-будаўнічых арганізацый-падрадчыкаў і жыхарамі Мінскага раёна, адказаў на іх пытанні, у тым ліку па міжнароднай тэматыцы.




## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір ЗІНОЎСКІ, міністр эканомікі:**

*«Адзначу пазітыўныя зрухі ў эканоміцы ў апошні час. З месяца ў месяц, хоць на дзве дзясятыя, на тры дзясятыя, ёсць рост аб'ёму прамысловай вытворчасці, ёсць зніжэнне запасаў гатовай прадукцыі на складах, а значыць, з'яўляецца больш сродкаў у прадпрыемстваў для вытворчасці прадукцыі, якая будзе прадавацца. Мы чакаем, што ВУП па выніках 2015-га будзе не меншы, чым у 2014 годзе».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 07.10.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 17629,00 | ▼ |
| Еўра | 19756,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 270,47 | ▲ |
| Укр. грыўня | 829,99 | ▲ |

■ Выбары-2015

Лідзія ЯРМОШЫНА:

## «УВЕСЬ ПАПЯРЭДНІ ПЕРЫЯД ВЫБАРЧАЙ КАМПАНІІ АЖЫЦЦЯЎЛЯЎСЯ Ў АДПАВЕДНАСЦІ З ЗАКОНАМ»

**Кампанія гэтага года пацвярджае, што наша выбарчае заканадаўства развіваецца ў правільным кірунку, дэмакратычныя працэдуры становяцца зладжанымі і ўспрымаюцца ўсім насельніцтвам. Пра гэта ў чарговым відэазвароце на інфармацыйным рэсурсе vybory2015.by заявіла старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзія ЯРМОШЫНА.**

— Усе кандыдаты ў прэзідэнты стварылі асабістыя фінансавыя фонды, з якіх аплачвалі сваю перадвыбарную агітацыйную прадукцыю, а таксама іншыя выдаткі, звязаныя з правядзеннем выбараў, — канстатавала яна. — Прыемна бачыць, што такая форма фінансавання прыжываецца ў нас у краіне і хутка стане звыклай. Мы ўсё далей адыходзім ад бюджэтнага фінансавання перадвыбарнай агітацыі, пераходзячы на сучасныя дэмакратычныя нормы фінансавання выбараў.

Па словах старшыні Цэнтрвыбаркама, кандыдаты ў прэзідэнты актыўна карысталіся магчымасцямі вядзення перадвыбарнай агітацыі ў сродках масавай інфармацыі.

— Можна з упэўненасцю казаць, што ўвесь папярэдні перыяд выбарчай кампаніі ажыццяўляўся ў адпаведнасці з законам і ў вызначаныя тэрміны, — заявіла Лідзія Ярмошына.

Яна нагадала, што ў краіне ўтворана 6129 участковых выбарчых камісій. З іх 49 за мяжой, пры нашых дыпламатычных прадстаўніцтвах. Участкі адкрыліся ў 37 дзяржавах. Адпаведна 6080 участкаў для галасавання ўтворана ў Беларусі.

Старшыня ЦВК таксама звярнула ўвагу на той факт, што дакладную колькасць выбаршчыкаў мы даведаемся толькі па выніках падліку галасоў. Звесткі аб 6 мільёнах 995 тысячах выбаршчыкаў, што ўключаны ў спісы для галасавання, не з'яўляюцца канчатковымі і пастаянна ўдакладняюцца.

Лідзія Ярмошына заўважыла, што ў самым пачатку кампаніі было 15 прэтэндэнтаў, якія жадалі ўдзельнічаць у выбарах. Зарэгістравана 8 ініцыятыўных груп па вылучэнні кандыдата ў прэзідэнты. У выніку кандыдатамі на найвышэйшую дзяржаўную пасаду сталі чатыры прэтэндэнты. Па словах старшыні Цэнтральнай камісіі, усе яны праводзяць дастаткова актыўную агітацыйную кампанію.

— У краіне праведзена больш за 500 мерапрыемстваў у закрытых памяшканнях — гэта сустрэчы з выбаршчыкамі, працоўнымі калектывамі, — праінфармавала старшыня ЦВК. — Большую частку мерапрыемстваў правяла група кандыдата Лукашэнкі. Больш за 300 пікетаў і іншых вулічных масавых мерапрыемстваў праведзена ініцыятыўнымі групамі. Тут найбольш актыўныя ініцыятыўныя групы і давераныя асобы кандыдатаў у прэзідэнты Лукашэнкі і Гайдукевіча. Такім чынам, нашы кандыдаты выкарыстоўваюць дадзеныя ім шырокія магчымасці для правядзення сустрэч з выбаршчыкамі.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

## ЯК ПРАХОДЗІЎ ПЕРШЫ ДЗЕНЬ ДАТЭРМІНОВАГА ГАЛАСАВАННЯ

**Карэспандэнты «Звязды» наведалі выбарчыя ўчасткі ў розных рэгіёнах краіны.**

### БРЭСТ: АДНЫ МІМА ПРАЯЗДЖАЛІ, ДЛЯ ІНШЫХ — ТРАДЫЦЫЯ

Для мяне, якая ні разу не галасавала датэрмінова, такая высокая актыўнасць нашых грамадзян у першы дзень нават крыху здзівіла. Я разлічвала дачакацца аднаго-двух, ну, можа, трох выбаршчыкаў. Але за паўтары гадзіны на брэсцкім участку №3, размешчаным у будынку будаўнічага трэста па бульвары Шаўчэнкі, прагаласаваў добры дзясятак людзей. І першым, каго сустрэла ваша карэспандэнтка, стаў добразычлівы і гаваркі пенсіянер Анатоль Шмялёў.



**На выбарчым участку ў Гомелі.**

Анатоль Дзмітрыевіч паведаміў, што заўтра ён збіраецца паехаць у Оршу, мае намер пагасцяваць у сястры, таму прыйшоў сёння выканаць свой грамадзянскі абавязак. Яшчэ ён сказаў, што галасуе за стабільнасць, бо не хоча ніякіх перабудоў, вялікіх перамен альбо ўзрушэнняў:

СТАР. 2

■ Камунальныя стасункі

## БАТАРЭЯМ ДАЗВОЛІЛІ ЦЯПЛЕЦЬ

**Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі падрыхтавала і накіравала ў рэгіёны ўзгадненне ўключэння ацяплення на ўсёй тэрыторыі краіны з 7 кастрычніка. Аб гэтым паведаміў карэспандэнту «Звязды» памочнік міністра ЖКГ Генадзь АКСЦІЛОВІЧ.**

Гэтым рашэннем дазваляецца пачаць ацяпляць у першую чаргу памяшканні медыцынскіх і сацыяльных арганізацый, школы, дзіцячыя садкі і іншыя дашкольныя ўстановы, а таксама музеі, архівы і бібліятэкі. Па другой чарзе ацяпленне будзе падключана ў жылых дамах, інтэрнатах і сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных установах. А вось аб падключэнні ацяплення адміністрацыйных будынкаў гаворка пакуль не ідзе.

Спецыяліст Міністэрства ЖКГ удакладніў, што накіраванае ўзгадненне дазваляе аблвыканкамам кожнага асобнага рэгіёна самастойна прымаць рашэнне аб канкрэтнай даце падключэння ацяплення ў залежнасці ад тэмпературнага рэжыму, а таксама іншых фактараў гатоўнасці спажыўцоў і пастаўшчыкоў цяпла. Напрыклад, у сталіцы цяпло пачало паступаць у школы і дзіцячыя сады, бальніцы, іншыя медыцынскія і сацыяльныя ўстановы ўжо 6 кастрычніка, а ў жылых дамах ацяпленне пачынаюць уключаць з серады.

Выканаўца абавязкаў начальніка ўпраўлення гарадской гаспадаркі і энергетыкі Мінгарвыканкама Марына Малаева паведаміла, што такое рашэнне прынята ў сувязі з рэзкім пахаладаннем, якое прагназуецца. На працягу трох-чатырох дзён ацяпленне з'явіцца ва ўсіх жылых дамах Мінска. Прадстаўніца Мінгарвыканкама адзначыла, што ўсе спажыўцы і пастаўшчыкі цяпла Мінска гатовы да пачатку ацяпляльнага сезона. Пашпарты гатоўнасці атрымалі 117 ЖЭС, а таксама ўвесь жылы фонд, установы адукацыі і аховы здароўя. У горадзе створаны неабходныя запасы топачнага мазуту і іншых відаў паліва.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Вярхоўная рада дазволіла іншаземцам служыць ва ўкраінскай арміі



Вярхоўная рада прыняла ў другім чытанні законапраект «Аб праходжанні іншаземцамі ваеннай службы ва ўзброеных сілах Украіны». Ён дае грамадзянам іншых дзяржаў магчымасць служыць у войску краіны. У тлумачальнай запісцы да праекта закона гаворыцца, што мэтай яго прыняцця з'яўляецца «павышэнне баяздольнасці УСУ і змяншэнне чалавечых і фінансавых выдаткаў Украіны, якія з'яўляюцца наступствам баявых дзеянняў». На думку дэпутатаў, пасля таго, як у іншаземцаў з'явіцца магчымасць легальна служыць у войску, краіна атрымае «некалькі баяздольных, вопытных і матываваных падраздзяленняў агульнай колькасцю да тысячы чалавек». Чакаецца, што гэты крок прывядзе да зніжэння патрэбы ў мабілізацыі ўласных грамадзян.

### Супрацоўнікі Air France напалі на сваіх кіраўнікоў



Супрацоўнікі авіякампаніі Air France ўварваліся на нараду кіраўнікоў кампаніі і збілі двух з іх, паведамляюць інфармагенцтвы. Незадаволеныя работнікі ўварваліся ў той момант, калі цэнтральны савет дырэктараў кампаніі абмяркоўваў планы звальнення 2,9 тыс. супрацоўнікаў. Сярод пацярпелых ад рук раз'юшаных мітынгоўцаў аказаўся дырэктар па працоўных адносінах кампаніі Ксаўе Брасет, а таксама дырэктар Air France ў Арлі П'ер Плісанье. Абодвум мужчынам мітынгоўцы разарвалі кашулі. На дапамогу пацярпелым прыйшлі праваахоўныя органы. Праўленне кампаніі ўжо заявіла, што падасць у суд на супрацоўнікаў за гвалтоўныя дзеянні.

ISSN 1990 - 763X
15192
9 771990 763008

## ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### Больш за 1,8 тыс. мігрантаў выратаваны каля берагоў Лівіі

Больш за 1,8 тыс. мігрантаў выявілі на борце шасці суднаў, якія дрэйфавалі ў Міжземным моры недалёка ад узбярэжжа Лівіі, паведамляюць інфармагенцтвы. Судны з мігрантамі — чатыры зламаныя катары і дзве гумовыя шлюпкі — заўважыла берагавая ахова Італіі. У выратавальнай аперацыі прымалі ўдзел караблі ВМС Італіі, Ірландыі і Вялікабрытаніі. Маршрут з Лівіі ў Італію праз Міжземнае мора ў апошнія гады стаў асноўным напрамкам для перапраўкі нелегальных мігрантаў. Толькі за студзень—жнівень 2015 года дабрацца да Еўропы праз Міжземнае мора паспрабавалі больш за 300 тыс. чалавек, у той час як за ўвесь 2014 год іх было 219 тыс.



## КОРАТКА

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі Уладзіміра Пуціна з днём нараджэння. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў Беларусі высока цэняць прынцыповую пазіцыю Прэзідэнта Расіі ў дачыненні да далейшага ўдасканалення беларуска-расійскага партнёрства ва ўсіх фарматах.

**Пасол Беларусі ў Кубе будзе па сумяшчальніцтве ўзначальваць беларускую дыпмісію ў Мексіцы.**

Сяўба азімых збожжавых у краіне завершана. Агульная плошча пасеваў на 1,5 працэнта большая за запланаваную.

**Пріорбанк запусціў сэрвіс пераводу грашовых сродкаў са сваіх картак на карткі любога банка Беларусі праз інтэрнэт-банк і мабільны дадатак Priorbank. Максімальная сума разавай аперацыі складае Br5 млн.**

Ордэнам Маці ўзнагароджаны 8 тыс. 94 жанчыны, якія нарадзілі і дастойна выхавалі пяць і больш дзяцей. У гэтым годзе ўзнагароды ўдастоены 339 шматдзетных маці.

■ Так трымаць!

## БЯСЦЭННЫЯ КАШТОЎНАСЦІ

**Творчы праект «Сямейная газета» і загадчык аддзела фотаілюстрацыі газеты «Звязда» Анатоль Кляшчук сталі пераможцамі рэспубліканскага конкурсу сярод друкаваных і электронных сродкаў масавай інфармацыі «Моцная сям'я — моцная дзяржава». Віншуем калег!**

На гэты раз цырымонія ўзнагароджання пераможцаў конкурсу праходзіла ў фармаце «круглага стала», падчас якога шмат гаварылі не толькі пра фізічнае здароўе бацькоў і іх дзяцей, але і пра духоўнае. Бо не сакрэт: толькі тая дзяржава, дзе жывуць сем'і, моцныя і целам, і духам, з'яўляецца моцнай.

— Сям'я і дзяржаўнасць заўсёды былі традыцыйнымі беларускімі каштоўнасцямі, — заявіла на «круглым стале» «Моцная сям'я — моцная дзяржава: сацыяльная палітыка краіны» **міністр інфармацыі Беларусі Лілія АНАНІЧ.** — Гэтыя тэмы з'яўляюцца аднымі з прыярытэтных і ў нашых СМІ. Пацверджаннем таму сталі вынікі конкурсу, які ўжо не першы год праводзіцца Міністэрствам інфармацыі сумесна з Беларускім саюзам жанчын. Сёлета мы атрымалі больш за 100 работ ад 82 калектываў. Іх узровень вельмі высокі. Як міністр інфармацыі, лічу важным, каб СМІ і далей актыўна асвятлялі сацыяльную палітыку дзяржавы. Чым больш мы будзем працаваць па ўмацаванні пастулату «Моцная сям'я — моцная дзяржава», тым мацнейшай будзе наша краіна.

Паводле слоў **міністра працы і сацыяльнай абароны, старшыні Беларускага саюза жанчын Марыяны ШЧОТКІНАЙ**, у Беларусі створана спрыяльнае становішча для мацярынства:

— Сям'я знаходзіцца ў поле зроку як дзяржавы, так і Беларускага саюза жанчын. Больш за тое, саюз цесна працуе з усімі дзяржаўнымі структурамі. Радуе, што ў Беларусі расце колькасць шматдзетных сем'яў, цяпер такіх больш за 77 тысяч. Усё больш пар выказваюць жаданне мець і 2, і 3 дзяцей. Усё больш сем'яў уносяць свой уклад у развіццё краіны і грамадства.




**У намінацыі «Найлепшыя матэрыялы ў друкаваных рэспубліканскіх СМІ» перамог творчы праект «Звязды» «Сямейная газета».**

Падчас «круглага стала» адбыўся паказ адзення для ўсёй сям'і ад беларускіх вытворцаў. А таксама выступіў сямейны ансамбль Ровенскіх — лаўрэат конкурсу «Сям'я года — 2012». Дарэчы, усе ўдзельнікі мерапрыемства мелі цудоўную магчымасць палюбавацца на шчаслівыя сем'і вачыма Анатоля Клешчука — у фае прэс-цэнтра Дома прэсы былі выстаўлены работы нашага фатографа.

У межах размовы за «круглым сталом» быў дадзены старт рэспубліканскай акцыі «Сямейнае чытанне». Яе заснавальнікамі выступілі Міністэрства інфармацыі, Беларускі саюз жанчын, Саюз пісьменнікаў Беларусі і Выдавецкі дом «Звязда». Падрабязна пра акцыю кнігавыдаўцоў, пісьменнікаў і чытачоў — у наступным нумары.

**Надзея ДРЫЛА.**
**Фота Надзеі БУЖАН.**

# ЯК ПРАХОДЗІЎ ПЕРШЫ ДЗЕНЬ ДАТЭРМІНОВАГА ГАЛАСАВАННЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Нарадзіўся я ў Сібіры, мае дзіцячыя гады прыпалі на вайну, у 1945-м загінуў бацька... Перад вачыма прайшлі гістарычныя падзеі, у іх ліку развал Савецкага Саюза, рэформы, перабудова — шмат чаго прыйшлося перажыць нашаму пакаленню. Хачу, каб мае тры сыны і дачка жылі ў спакойнай краіне, гадавалі дзяцей, радаваліся ўнукам, каб усе мы ездзілі адно да аднаго ў госці, — заключыў гараджанін.

Паліна Маркаўна Лычук, былая выхавальніца інтэрната чыгуначнага тэхнікума, сказала, што любіць парадак і арганізаванасць: «Ёсць магчымасць для датэрміновага галасавання, значыць, трэба яе скарыстаць». А выкладчыца Таццяна Раманоўская заўважыла, што праязджала з дачкой міма ўчастка, вось і вырашылі зазірнуць. Потым аказалася, у Таццяны Міхайлаўны няма з сабой пашпарта. Але ёй падказалі, што і вадзіцельскае пасведчанне падыдзе. Маці з дачкой, да іх агульнага задавальнення, здолелі выкарыстаць сваё выбарчае права.

Цікава абазначыла прычыну сваёй яўкі на ўчастак Людміла Рындзюк: «Мне мама загадала, — смяецца Людміла Пятроўна. — Маёй маме 81 год. Яна сказала суседзям, што заўсёды галасуе ў першы дзень і дочкі з яе бяруць прыклад. Мама заўсёды была неабыякавым, актыўным чалавекам. А мы, хоць самі дасягнулі пенсійнага ўзросту, ва ўсім яе слухаемся. А калі шчыра, то ў нашых сямейных традыцыях — працавітасць, законапаслухмянасць і свядомасць».

Старшыня ўчастковай выбарчай камісіі Аляксандра КАМЫШКАЛА паведаміла карэспандэнту газеты, што з 10 гадзін, як толькі адкрыўся ўчастак, сюды ідуць грамадзяне розных узроставых катэгорый. Зранку было двое студэнтаў, якія на выхадныя збіраюцца да бацькоў.

Першы дзень на ўчастку папярэдняга галасавання аказаўся асабліва насычаным на наведвальнікаў. Маю на ўвазе не толькі выбаршчыкаў. Супрацоўнік гарадскога аддзела МНС Ягор Барысенка праверыў наяўнасць вогнетушыцеля і патрэбнай дакументацыі. Зазіралі і прадстаўнікі санітарнай службы, якія цікавіліся санітарнымі ўмовамі ў будынку.

Пакуль мы гаварылі са старшынёй камісіі, падышлі маладыя муж і жонка Ганчаровы. У спісах Ганна значылася пад прозвішчам Цуканава, і, згодна з яе новым пашпартам, у дакументы ўнеслі папраўку. Прагаласаваўшы, выбаршчыца пацікавілася, ці можа гэта зрабіць муж, бо ён хоць і жыве ў Брэсце, пакуль зарэгістраваны ў іншым горадзе. Уладзіміра ўнеслі ў дадатковыя спісы і прапанавалі запоўніць бюлетэнь. Пакідалі ўчастак маладыя людзі з добрым настроем — гэта было іх першае сямейнае галасаванне. З чым іх ад душы павіншавалі не толькі члены камісіі, але і назіральніца Таццяна Сашко. Таццяна Яўгенаўна назірала за ходам галасавання ад прафсаюзнай арганізацыі. І ў гэты час ад групы назіральнікаў была адна. А ўсяго заявілі намер наведаць участак №3 назіральнікі ад ветэранскай арганізацыі, ад партыі БНФ, ад групы грамадзян, ад працоўнага калектыву.

Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.



На выбарчым участку ў Мінску.

У Таццяны Сашко ніякіх заўваг не было. Яна адзначыла, што на ўчастку пануе добразычлівая атмасфера. На нумар тэлефона, які ўказаны ў запрашэннях, тэлефануюць выбаршчыкі і ўдакладняюць асобныя пытанні. У ходзе зверкі спісаў і па тэлефоне ўжо запісаліся 90 грамадзян, якія па стане здароўя пажадалі галасаваць дома. Побач з участкам несла службу міліцыянер Юлія Пастушэнка.

## ГОМЕЛЬ: ЖАДАННЕ БЫЦЬ ПЕРШЫМІ

**На ўчастку прыходзяць тыя, каму нязручна ў выхадныя заставацца ў горадзе. Многія пенсіянеры ідуць на выбарчы ўчастак №48 у Гомелі, бо хочуць быць першымі, хто аддаў свой голас за будучыню краіны.**

Студэнты-другакурснікі Гомельскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта імя Сухога Яўген Касцянка і Аляксандр Калеснік збіраюцца на выхадныя ад'ехаць да бацькоў у Мазыр і Лельчыцы. Таму прыйшлі адразу ж, як з'явілася такая магчымасць. Між іншым, участак для галасавання знаходзіцца ў тым інтэрнаце, дзе жывуць маладыя людзі. Дарэчы, хлопцы галасуюць упершыню, і таму памятныя сувеніры ім уручыў старшыня выбарчай камісіі Алена Конкіна.

— Цяпер адчуваю сябе па-сапраўднаму дарослым. Упершыню я самастойна буду выбіраць таго, каму аддам свой голас, — гаворыць Яўген. — Безумоўна, буду галасаваць за таго кандыдата ў прэзідэнты, якога лічу вартым, які можа палепшыць нашу краіну. Беларусь мне і цяпер падабаецца. Спадзяюся, што яна будзе толькі прыгажэць і багацець.

— Я — за квітнеючую і магутную Беларусь, — дадае Аляксандр. — Я павінен стаць добрым спецыялістам, металургам. Магчыма, і ў мяне атрымаецца зрабіць штосьці важнае ў сваёй прафесіі, а значыць, і для краіны. Для мяне важна адчуваць, што нешта ў грамадстве залежыць ад майго голасу.

Па словах старшыні Гомельскай абласной выбарчай камісіі Мікалая Стоша, усе ўчасткі для галасавання падрыхтаваны: на іх ёсць бюлетэні, усталяваны стэнды з інфармацыяй, неабходныя сродкі сувязі, аховы, арганізавана дзяжурства членаў выбарчых камісій:

— Напярэдадні мы правялі трэніроўку цэнтральнай выбарчай камісіі. Усе камісіі, якія ажыццяўляюць датэрміновае галасаванне, прыступілі да яго правядзення. Падрыхтоўка да галасавання, інструктаж членаў камісіі і назіральнікаў, шырокі доступ да ўсіх матэрыялаў, звязаных з выбарчым працэсам, з біяграфіямі кандыдатаў, дазваляюць гарантаваць, што выбары пройдуць паводле Выбарчага кодэкса і грамадзяне змогуць гарантавана рэалізаваць сваё права на свабоднае волевыяўленне. Людзі на выбарчыя ўчасткі ідуць. Не натоўпам, але многія, у тым ліку моладзь, прыходзяць галасаваць загадзя. Дарэчы, адначасова праходзяць сустрэчы з даверанымі асобамі кандыдатаў у прэзідэнты з выбаршчыкамі.

Больш за палову урнаў для галасавання на Гомельшчыне — празрыстыя. У вобласці паспелі вырабіць каля 650 такіх скрынь. Усяго тут налічваецца 1070 участкаў для галасавання. Чакаецца, што больш за 1 млн 101 тысячы выбаршчыкаў наведаюць іх за наступныя пяць дзён.

## ВІЦЕБСК: А НАВІЧКАМ — НАТАТНІК НА ПАМЯЦЬ

**У першы дзень датэрміновага галасавання на выбарах Прэзідэнта на ўчастку, які знаходзіцца ў славутай alma mater — Віцебскім дзяржаўным ордэна Дружбы народаў медыцынскім універсітэце — каля 11 гадзін раніцы выстраілася чарга маладых выбаршчыкаў.**

— Самыя першыя прыйшлі да адкрыцця ўчастка. Усяго ў нас зарэгістраваны 2224 выбаршчыкі. Акрамя жыхароў 18 дамоў, галасуюць студэнты — у асноўным малодшых курсаў. Тым, хто галасуе ўпершыню, дорым на памяць нататнік з лагатыпам універсітэта, — распавядае Ірына Гарадзецкая, старшыня ўчастковай выбарчай камісіі №37 Кастрычніцкага раёна г. Віцебска.

На момант нашай з ёй размовы на ўчастак прыйшла прыгожая брунетка. Высветлілася, што яна ўпершыню аддасць свой голас на прэзідэнцкіх выбарах.

— Прагаласавала датэрмінова, паколькі ў выхадныя дні трэба шмат чаго вучыць. Часу не будзе ў нядзелю прагаласаваць... Я вучыцца ў Віцебск прыехала з Магілёва, — сціпла адказала на пытанні журналіста Алеся Карпушэнка, студэнтка 4 курса лячэбнага факультэта вышэйзгаданага ўніверсітэта. Вучыцца яна добра. Пажартавала, што ўжо кандыдатка ў выдатніцы.

— Студэнты медыцынскага ўніверсітэта могуць быць у галоўны дзень галасавання на дзяжурствах у клініках. Дзяжураць у адпаведнасці з навучальным планам. Таму многія галасуюць таксама датэрмінова, — дадала старшыня камісіі.

Пацікавіўся ў яшчэ адной выбаршчыцы — дамы сталага веку — чаму яна сёння прыйшла на ўчастак.

— А я 11 кастрычніка прыеду дамоў увечары, калі ўжо галасаванне скончыцца. Вось і вырашыла датэрмінова прагаласаваць, — растлумачыла Ада Міхайлаўна Перунова.

На ўчастку ў дзень падрыхтоўкі рэпартажу былі зарэгістраваны 10 назіральнікаў. Скрынка для бюлетэняў празрыстая. За парадкам сочыць міліцыянер. Усё адпавядае патрабаванням.

11 кастрычніка на гэтым участку будуць арганізаваны выязны гандаль і вялікая канцэртная праграма. Выбаршчыкі ведаюць, што па добрай традыцыі тут гарантаваны і добры настрой.

Усяго ў Прыдзвінскім краі датэрмінова можна прагаласаваць на прыкладна 800 участках. У галоўны дзень выбараў запрацуюць яшчэ больш як 50 так званых закрытых участкаў: у бальніцах, прафілакторыях і гэтак далей. Маюць права прагаласаваць больш за 870 тысяч чалавек, у тым ліку каля 12 тысяч зробяць гэта ўпершыню.

## МІНСК: АСАБЛІВЫ НАСТРОЙ

**Выбарчы участак №6 Кастрычніцкага раёна Мінска, што размяшчаецца ў філіяле Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта — Мінскім дзяржаўным політэхнічным каледжы, нягледзячы на тое, што галасаванне толькі пачалося, не пустуе.**

Маладыя хлопцы і дзяўчаты заходзяць адразу па некалькі чалавек, распісваюцца насупраць свайго прозвішча, атрымліваюць бланкі і накіроўваюцца да кабінак для галасавання.

— Гэта нашы навучэнцы, — заўважыла журналістам Наталля Кунюўская, старшыня ўчастковай камісіі. — Для тых, хто галасуе ўпершыню, падрыхтаваны невялікія сувеніры: ручкі і святочныя паштоўкі. Многія маладыя людзі загадзя цікавіліся, калі можна прагаласаваць датэрмінова.

З улікам таго, што вялікая колькасць выбаршчыкаў на гэтым участку — навучэнцы каледжа, афармлены спецыяльны стэнд: «Куток маладога выбаршчыка», на якім размешчана інфармацыя пра ўзрост, з якога чалавек мае права прагаласаваць, пералік дакументаў, якія неабходна браць з сабой для гэтага.

Аднак у выбарчых спісах гэтай камісіі не толькі студэнты, але і жыхары дамоў, што знаходзяцца паблізу.

— Тыя, хто галасуе ўпершыню, прыходзяць, як правіла, натхнёныя, з усмешкамі на тварах — відаць, што для іх гэта свята, — дзеліцца сваімі назіраннямі выкладчыца каледжа, член участковай камісіі Наталля Аўтушка. — Адчуваецца адказнасць, жаданне выканаць грамадзянскі абавязак. Як правіла, пытанняў не задаюць — ідуць галасаваць ужо падрыхтаванымі.

На той момант, калі мы прыйшлі на ўчастак, датэрмінова прагаласавалі ўжо каля 20 чалавек.

Сяргей, студэнт трэцяга курса Мінскага дзяржаўнага політэхнічнага каледжа, якраз з тых, хто галасаваў упершыню.

— Пра кандыдатаў пачытаў загадзя, — расказвае хлопец.

Яго аднакурснік Уладзіслаў, які таксама галасуе на прэзідэнцкіх выбарах першы раз у жыцці, дадае:

— Уражанні прыемныя. Пра выбары чытаў, абмяркоўваў іх з сябрамі. Прыйшоў прагаласаваць, каб не быць раўнадушным.

На ўчастку прысутнічалі і назіральнікі. Уладзімір Буневіч, прадстаўнік грамадскага аб'яднання «Белая Русь», падкрэсліў: усё праходзіць на дастаткова высокім узроўні.

— Своечасова былі адкрыты скрыні для галасавання — за 15 хвілін да пачатку. Усе члены камісіі былі на месцах. Відаць, што моладзь актыўная, нават у першы дзень датэрміновага галасавання. Некалькі чалавек пажылога ўзросту таксама прыходзілі аддаць свае галасы. Арганізацыя на добрым узроўні, ніякіх заўваг не маю.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*
**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*
**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *astashkevich@zviazda.by*
**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*

■ Развітальнае

# ВЕРАЙ І ПРАЎДАЙ



Не стала Алеся Савіцкага. Гэтая трагічная навіна ашаламіла сваёй нечаканасцю і непрыхаванай жорсткасцю. Вядома, кожны з нас смяротны. Дый узрост у Алеся Ануфрыевіча быў такі, якога ўдаецца дасягнуць далёка не кожнаму. Але ад усведамлення гэтага яшчэ больш балюча. Бо ўсе, хто ведаў яго, даўно звыкліся з тым, што ён абавязкова павінен быць поруч. Мудры, сардэчны, разважлівы. Са сваёй нязменнай густой чупрынай, якая з гадамі ўсё больш пакрывалася серабром.

У астатнім жа заставаўся гэткім жа, як і дзесяць, дваццаць, трыццаць гадоў назад. Па-ранейшаму валодаў зайздроснай памяццю. Мог без перапынку чытаць вершы многіх і многіх паэтаў. І не толькі беларускіх. Як з паўнюткага рога, з яго вуснаў так і сыпаліся розныя гісторыі. А які шчыры, усмешлівы ён быў!

Так, ужо быў. Калі што і засталося пасля яго, дык наша памяць. Дый, яшчэ, безумоўна, ягоныя творы. Яго ж творчасць — творчасць патрыярха беларускай літаратуры — надзіва шматгранная. Аднолькава плённа ён працаваў у розных жанрах. Гэтаксама з аднолькавым майстэрствам закранаў самую розную тэматыку. Аднак асаблівае важкае слова сказаў, асэнсоўваючы падзеі Вялікай Айчыннай вайны. Гэта заканамерна: талент заўсёды ярчэй раскрываецца тады, калі аўтар піша пра найбольш блізкае яму, а тым больш звяртаецца да падзей, непасрэдным удзельнікам якіх з'яўляўся сам. А. Савіцкі ж гераічна змагаўся з нямецкім фашызмам: партызан, камандзір падрыўной групы, вызваляў Літву, Польшчу, прымаў удзел у баях за ўзяцце Берліна.

Такое ніколі не забываецца. Тым больш калі ты пісьменнік. Ведаеш, як пра ўсё гэта пісаць. Праўдзіва, таленавіта, бескампрамісна. Так ён і пісаў. Часам на мяжы сваіх магчымасцяў, калі, здавалася, балюча, нясцерпна балюча было не толькі ягоным героям, а і яму самому. Асабліва ў раманах «Зямля не раскажа», «Верай і праўдай», «Літасці не чакай», «Памерці заўсёды паспееш», «Верасы», «Обаль». Пасля Савіцкага засталося нямала і твораў, прысвечаных сучаснасці, а таксама кніг для дзяцей, за якія яму была прысуджана Дзяржаўная прэмія Рэспублікі Беларусь.

Алесь Ануфрыевіч належаў да тых людзей, якія могуць стаць героем серыі «Жыццё знакамітых людзей Беларусі». Верыцца, што з цягам часу такая кніга абавязкова з'явіцца. Пакуль жа хочацца сказаць: «Бывай, наш дарагі старэйшы таварыш! Бывай, цудоўны чалавек і выдатны пісьменнік. Няхай пухам будзе табе родная зямля, якую ты мужна, гераічна абараняў ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і якую праславіў у сваіх творах...»

**Алесь МАРЦІНОВІЧ,**
**лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь.**

***Калектыў РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» выказвае шчырае спачуванне родным і блізкім Алеся Ануфрыевіча САВІЦКАГА.***

# ЗАЦІКАЎЛЕНЫЯ Ў ЗАХАВАННІ ПОЛАЦКА

**Сёння ў Нацыянальным мастацкім музеі адбываецца абмеркаванне праблемы захавання гісторыка-культурнай спадчыны Полацка. У ім прымаюць удзел прадстаўнікі Міністэрства культуры, Полацкага райвыканкама, чакаецца ўдзел намесніка прэм'ер-міністра Наталлі Качанавай. Выдавецкі дом «Звязда» ажыццяўляе інфармацыйную падтрымку гэтай ініцыятывы.**

Удзельнікі пасяджэння абмяркуюць розныя прапановы па рэгенерацыі гістарычнага цэнтра Полацка, паспрабуюць ацаніць стан гістарычных помнікаў, якія захаваліся ў старажытным горадзе, прадумаюць магчымыя захады па іх захаванні і аднаўленні.

Арганізатарамі падзеі выступілі Беларускі фонд культуры, Беларускі камітэт Міжнароднай рады па помніках і мясцінах (ІКАМОС) і Грамадская назіральная камісія пры Міністэрстве культуры па ахове гісторыка-культурнай спадчыны. Апошнюю ўзначальвае **Анатоль БУТЭВІЧ**, які адзначае:

— Большасць помнікаў, з якімі сёння вядзецца праца ў Полацку, датуецца XVIII стагоддзем. Аднак важна ў гэтым горадзе паказаць гісторыю розных часоў. Бо Полацк — старажытны цэнтр праваслаўя, цэнтр увогуле беларускага хрысціянства і дзяржаўнасці. Хацелася б, каб гэта было зразумела і па знешнім выглядзе горада, тым, што захоўваецца ў яго музеях. Мы абмяркуем і сітуацыю, якая склалася вакол полацкага замчышча — ці магчыма яго аднаўленне і якім чынам гэта можна зрабіць. Нагадаю, што канцэпцыя развіцця горада была прынята ў 2007 годзе. Трэба вызначыцца, адпавядае яна сучаснасці ці, мажліва, патрабуе ўнясення пэўных змен?

Гістарычная частка горада сёння мае статус нацыянальнага гісторыка-культурнага запаведніка. Аднак падпарадкоўваецца запаведнік Віцебскай вобласці. Магчыма, падпарадкаванне яго наўпрост дзяржаве паспрыяла б прытоку большых інвестыцый, павышэнню статусу гэтага аб'екта, пра што таксама будзе весціся размова на пасяджэнні.

На думку Анатоля Бутэвіча, важны і сам факт далучэння грамадскасці да ўдзелу ў аднаўленні і захаванні такога значнага аб'екта.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.** *nina@zviazda.by*

■ І мы там былі

# АД РОКА ДА ДЖАЗА

## «Залаты шлягер» у Магілёве сабраў вялікую колькасць прыхільнікаў рэтра-музыкі

**На працягу 5 дзён Магілёў жыў атмасферай міжнароднага музычнага фестывалю «Залаты шлягер-2015». Сёлета ён адзначыў свой 20-гадовы юбілей.**

Прывітанне Прэзідэнта краіны Аляксандра Лукашэнкі гасцям і ўдзельнікам фестывалю агучыў падчас адкрыцця музычнага свята міністр культуры Барыс Святлоў.

Пры ўсёй сваёй прадказальнасці фестываль не перастае радаваць сюрпрызамі. Славутыя тэнары Міхаіл Губскі, Эдуард Мартынюк, Руслан Брагар, Нурлан Бекмухаметаў спявалі для магіляўчан залатыя хіты айчыннай і замежнай эстрады ў суправаджэнні аркестра народных інструментаў імя народнага артыста Беларусі Л. Іванова пад кіраўніцтвам Мікалая Алданава.

Іскрынкай фестывальнай праграмы стаў канцэрт «зорак» сусветнага і айчыннага джаза, у якім выступілі Мэла Уолдран, Тавіс Мінер, Premier Orchestra, іншыя выканаўцы. Дарэчы, адбыўся ён дзякуючы неабыякавай пазіцыі вядомага магілёўскага бізнесмена, гендырэктара СП «Сервалюкс» Яўгена Баскіна. Ён сам захапляецца джазам і зрабіў роднаму гораду такі выключны падарунак.

Адбыліся цёплыя сустрэчы з вядомымі «зоркамі» эстрады Галінай Нянашавай, Мікалаем Трубачом, Рыгорам Гладковым, Аляксандрам Панаётавым, Вячаславам Малежыкам. Шмат добрых эмоцый і прыемных успамінаў падарыў сольны канцэрт Аляксандра Іванова і групы «Ронда».

У рамках мерапрыемства адбыліся рэтра-паказ мод, шэсце «зорак» па чырвонай дывановай дарожцы. Артысты з задавальненнем рабілі разам са сваімі паклоннікамі сэлфі і раздавалі аўтографы. Пры ўсёй сваёй занятасці спевакі знаходзілі час, каб пасадзіць дрэвы на кляновай алеі каля Палаца культуры.

Канцэрты суправаджалі выставы-кірмашы прадпрыемстваў Магілёўскай вобласці, асеннія кірмашовыя экспазіцыі падворкаў, нашумелы летась маладзёжны праект «Дранік-фэст». У фае Палаца культуры вобласці працавала выстава карцін, зробленых удзельнікамі мінулых фестываляў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

# У спакойнай абстаноўцы

**Падчас фінальнага этапу выбарчай кампаніі важна стварыць максімальна бяспечныя ўмовы для тых, хто прыйдзе на ўчасткі.**

— Пры правядзенні датэрміновага галасавання і ў асноўны дзень выбараў прыняты дадатковыя захады па ахове грамадскага парадку, — паведаміў **начальнік упраўлення аховы правапарадку ГУАПП Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі Дзмітрый КУР'ЯН**. — З 5 па 12 кастрычніка арганізавана кругласутачная работа аператыўна-сітуацыйнага штаба МУС і аналагічных штабоў у рэгіёнах. Разам з тым асабісты склад органаў унутраных спраў і ўнутраных войскаў МУС пераведзены на ўзмоцнены варыянт нясення службы.

Супрацоўнікі Міністэрства ўнутраных спраў наладзілі цеснае ўзаемадзеянне з выбарчымі камісіямі разнастайных узроўняў і з мясцовымі ўладамі. Увогуле ж службовая дзейнасць МУС падчас выбараў праходзіць па двух напрамках. Гэта арганізацыя аховы грамадскага парадку ды бяспекі падчас выбарчай кампаніі і падрыхтоўка ў адпаведнасці з заканадаўствам месцаў для галасавання на аб'ектах органаў унутраных спраў і ўнутраных войскаў.

— Супрацоўнікі тэрытарыяльных органаў узялі пад ахову ўсе ўчасткі пасля паступлення бюлетэняў, — працягвае Дзмітрый Кур'ян. — Цяпер мы не бачым фактараў, якія могуць аказаць негатыўны ўплыў на ход выбарчай кампаніі. Яна праходзіць у спакойнай абстаноўцы.

Яшчэ адзін важны аспект парадку на выбарчых участках — гэта проціпажарная бяспека. Упор супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях рабілі не толькі на прафілактыку магчымых узгаранняў, але і на тое, каб забяспечыць даступнасць праездаў да аб'ектаў, у якіх знаходзяцца выбарчыя ўчасткі. Не сакрэт, што многія ўнутрыдваровыя праезды ў кварталах шматпавярховай забудовы вельмі шчыльна запаркаваны аўтамабілямі, з-за чаго падабрацца цяжкай тэхніцы ратаўнікоў да патрэбнага месца няпроста.

— Мы правялі інструктажы са старшынямі ўсіх выбарчых камісій і кіраўнікамі аб'ектаў, дзе знаходзяцца ўчасткі для галасавання, праверылі, як працуюць сістэмы пажарнай сігналізацыі, звярнулі ўвагу на стан эвакуацыйных выхадаў, — зазначыў **намеснік начальніка ўпраўлення аварыйна-выратавальных службаў і ліквідацыі надзвычайных сітуацый Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Анатоль БАЛЯБІН**. — З асабістым складам праводзіліся дадатковыя заняткі па ліквідацыі пажараў на выбарчых аб'ектах. Ужо працуюць аператыўныя штабы па кантролі за падтрыманнем пажарнай бяспекі і нясеннем службы. У дзень правядзення выбараў на кожным участку будуць дзяжурыць нашы супрацоўнікі.

Як запэўніў **начальнік аддзела арганізацыі медыцынскай абароны пры надзвычайных сітуацыях Міністэрства аховы здароўя Алег ПАНЧУК**, на ўсіх выбарчых участках створаны медыцынскія пункты. А ў бальніцах выдзелены рэзервовыя ложкі на той выпадак, калі кагосьці давядзецца неадкладна шпіталізаваць.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.** *schklennik@zviazda.by*

■ Мы — разам

# ГАЛОЎНАЕ — БЫЦЬ НЕАБЫЯКАВЫМ



**Лічаныя дні засталіся да кульмінацыі прэзідэнцкай выбарчай кампаніі. Лілія МАРОЗ, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, разважае аб тым, чаму варта прыйсці на выбары і наколькі важна выказаць сваю грамадзянскую партыю.**

## ЯК НА СВЯТА

«Як першы раз ішла на выбары, ужо не ўзгадаю. Але памятаю, што бацькі заўжды бралі нас, сваіх дзетак, галасаваць. Там, на выбарчым участку, — музыка, кветкі, дэфіцытныя ў той час цукеркі, апельсіны і сыравэнджаная каўбаса... Пасля галасавання збіраліся сем'ямі, гутарылі, дарослыя абмяркоўвалі штосьці, жартавалі. Для нас, маленькіх, гэта было сапраўднае свята на фоне тых сціплых умоў, у якіх мы ў той час жылі. Цяпер, вядома, усё моцна змянілася, але тое прыемнае выбарчае хваляванне так і засталося са мной на ўсё жыццё.

Я мама дваіх дзяцей, у мяне 5 унукаў. Мы ўсе разам ходзім на выбары. Для ўнукаў гэта асаблівая радасць. Зразумела, цукеркай іх не здзівіш. Але яны з такім непрыхаваным гонарам апускаюць бюлетэнь ва ўрну! Зразумела ж, галасую я самастойна, а самае прыемнае пакідаю ім. Калі пасля прыходзім дадому, унукі пастаянна пытаюцца: «Бабуля, калі яшчэ пойдзем на выбары?».

## ТОЛЬКІ НЕ ЛЯНУЙЦЕСЯ!

«У нас, мне здаецца, для тых, хто жадае працаваць, усе магчымасці ёсць. Асабліва для моладзі. Праўда, часта маладыя людзі проста лянуюцца, шмат часу праводзяць, гуляючы ў камп'ютары. Зразумела, што хацелася б прыйсці на першае месца працы і адразу атрымліваць высокую зарплату. Трэба разумець, што ўсё будзе, няхай не ў адзін момант. А каб заробак павысіўся, трэба шмат і планамерна працаваць, а не вінаваціць абставіны.

Не ведаю, як у астатніх сем'ях, я сваіх унукаў з дзяцінства прывучаю працаваць і цаніць тое, што зрабілі іншыя. У нас ёсць дача — невялікі дамок у вёсцы. Штолета яны ў мяне там працуюць. Не ад раніцы да вечара, але ж без справы не заседжваюцца. Згадзіцеся, сёння ўсё можна набыць: і грыбы, і ягады, і садавіну, і гародніну. Але яны павінны ведаць, дзе растуць тыя ягады і грыбы, як іх збіраць, як вырошчваць агуркі і капаць увосень бульбу. Калі ідзём у лес — няхай кубак, няхай паўлітра збяруць ягад ці грыбоў сваімі рукамі. Бульбу капаць — няхай толькі кошык ці два, але самі, прыклаўшы ўласныя намаганні. Майму старэйшаму ўнуку 14 гадоў, малодшаму — 2, але ўсе працуюць на лецішчы.

Яшчэ ўнукі займаюцца спортам. Старэйшы — брэйкдансам ужо 3 гады. Другі ў басейне плавае, унучкі ходзяць на танцы. Дзяцей заўжды трэба накіроўваць, паказваць ім, што карысна, і тлумачыць, што можа нашкодзіць. Самы малодшы ў 2 гады ўжо ведае, як уключыць гульню на маміным тэлефоне. Збоку выглядае дзіўна і нават крыху пужае... А трэба ж вяртацца да духоўнасці. Чытаць дзецям кнігі на ноч, усёй сям'ёй наведваць тэатры, разам працаваць, размаўляць штовечар. Інакш адкуль узяцца цікавасці да жыцця? У сям'і трэба падтрымліваць, выстройваць цёплыя чалавечыя адносіны. Калі пасля маленькі чалавек вырастае, то ў яго будзе актыўная жыццёвая пазіцыя.

## ЦАНІЦЬ ТОЕ, ШТО МАЕМ

«Я памятаю пачатак цяжкіх 1990-х. Маладое пакаленне ўжо гэта забыла, і мае дзеці таксама. Як мы стаялі ў стомных чэргах, каб набыць па купонах кавалак масла, пачак цукру, а што казаць пра абутак і садавіну... Памятаю, аднойчы згубіла тыя купоны — і галасіла, бо як жа дзяцей карміць? Усё змянілася за апошнія 20 гадоў. Раней у большасці людзей была думка і мара, як набыць машыну. А цяпер — куды яе прыпаркаваць. Калі я была падлеткам, то тыя, у каго быў «масквіч», лічыліся сапраўды багатымі людзьмі. А сёння ў кожнага трэ нае аўто. Можа, не ў кожнага яно статуснае, цяга ўласале ўсё ж такі ёсць. Гэта ўжо сапраўды сродак перасоўвання, а не раскоша. Таму відавочна, што жыццё наша і маё ў прыватнасці змянілася ў лепшы бок. Праўда, асабіста я езджу на грамадскім транспарце.

Часта выязджаю ў выканкамы, і там мы абмяркоўваем рэалізацыю нормаў Дэкрэта №18 аб дзяржаўнай падтрымцы нядобранадзейных сем'яў. Спачатку, як выйшаў дэкрэт, не ўсе людзі яго прымалі, крытыкавалі нават часам. Але ён сапраўды дзейнічае. Дзеткі, якія раней трапілі б у дзіцячы дом, цяпер у прыёмных сем'ях. Шмат гора-сем'яў выправіліся. За той тэрмін, як дзейнічае дэкрэт, закрыліся 25 дамоў-інтэрнатаў. Мы маглі б не звяртаць увагу — няхай жывуць, як ім хочацца. Але ўлады і людзі не засталіся абыякавымі і выправілі не адзін чалавечы лёс».

## ВЫБРАЦЬ БУДУЧЫНЮ ДЛЯ КРАІНЫ

«Я ўсіх запрашаю схадзіць на выбары. Каб не панавала абыякавасць. Мы ж выбіраем не толькі асобу, а будучыню, далейшы шлях развіцця краіны. Асабіста мне не ўсё роўна, у якую школу будуць хадзіць мае ўнукі, у якой паліклініцы будзе лячыцца мая састарэлая маці, па якіх дарогах будзем ездзіць на лецішча на выхадных. Таму трэба прыйсці на выбары і аддаць свой голас за кандыдата, які даспадобы. Асабіста я ўжо зрабіла свой выбар. Лічу, што на чале нашай дзяржавы павінен стаяць чалавек моцны, прынцыповы, сумленны, і каб ён не займаўся палітыканствам, папулізмам, самарэкламай, а пацвярджаў свае абяцанні канкрэтнымі дзеяннямі. Каб жыццё народа пад яго кіраўніцтвам паляпшалася.

Пры гэтым нельга спыняцца на дасягнутым. Трэба ставіць перад сабой мэту, бачыць перспектыву і дасягаць яе. Без нерваў, без шокавай тэрапіі, павольна і паступова. Усё матэрыяльнае можна палепшыць. Галоўнае, каб быў спакой. Каб раніцай можна было прачнуцца і ведаць, што ў нас будзе мірнае неба над галавой, што на нашай зямлі не будуць разрывацца снарады. Каб раніцай дзеці пайшлі ў садок і школу, студэнты — у інстытут, дарослыя — на працу. Каб былі ўмовы для таго, каб спакойна жыць і рабіць краіну лепшай.

Ісці на выбары ці не — асабістае рашэнне кожнага чалавека. Калі казаць юрыдычнай мовай, то гэта грамадзянскі абавязак, бо гэта прадугледжана вяршэнствам закона, гэта прывілей народа, якім нельга не скарыстацца. Гэта ўсё зразумела. Калі ж разважаць па-чалавечы, то трэба схадзіць на выбары, каб, перш за ўсё, выбраць далейшы шлях развіцця краіны. Хто гэта зробіць? Толькі неабыякавыя людзі. Некаторыя кажуць: «Навошта ісці на выбары? Там і без нас усё вырашылі». Пакажыце, хто і што вырашыў і што падлічыў? Гэта элементарнае няведанне. Бо чым больш людзей прыйдзе галасаваць, тым болей сумленнымі і празрыстымі будуць выбары. Ніхто нічый голас не скарыстае. А за каго яго аддаць — выбар трэба рабіць з розумам. Азірнуцца вакол, пабачыць, колькі зроблена, што яшчэ неабходна палепшыць, і, нарэшце, прагаласаваць за вартага кандыдата.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

■ Усе — на кірмаш!

# «ЛІЛЕЯ» ПА ПЯЦЬ, А «ЛАСУНАК» — ПА ТРЫ

## Прыйшоў час рыхтаваць «стратэгічны запас»



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Сельскагаспадарчыя кірмашы для многіх жыхароў сталіцы становяцца добрай магчымасцю нядорага набыць гародніну і садавіну хоць на ўсю зіму. І не дзіва — кошты самыя прымальныя, асартымент — «выбірай — не хачу». Выгадна ўсім: вытворцы могуць абысціся без пасрэднікаў, пакупнікі — атрымаць сельскагаспадарчую прадукцыю. Карэспандэнты «Звязды» накіраваліся на некалькі мінскіх кірмашоў і паназіралі, як ідзе яе рэалізацыя.**





Адна з агульнагарадскіх пляцовак знаходзіцца ў самым цэнтры Мінска, побач з Палацам спорту. Яшчэ да 9 раніцы сюды прыехалі машыны з гаспадарак усёй краіны. На прылаўках гандлявалі мясной і малочнай прадукцыяй, рыбай, мёдам, але сельскагаспадарчым балем правіла гародніна. Бульба гатункаў «Ласунак» і «Журавінка» па тры тысячы рублёў за кілаграм (трохі танней, чым у гандлёвых сетках), даражэйшая «Лілея» — па пяць. Відаць, што «другі хлеб» сёлета ўрадзіў — прыгожыя буйныя клубні так і просяцца змяніць месца прапіскі.

Памідоры і агуркі ў горадзе можна знайсці і таннейшыя: іх аддаюць па кошце ад 10 да 20 тысяч за кілаграм. Затое гандляры ахвотна распавядаюць пра паходжанне гародніны. Калі камусьці важна ведаць, што яго гурок родам са Століншчыны, — калі ласка. Дарэчы, адтуль жа прыехала і некалькі машын з капустай: набыць кілаграм белакачаннай можна ўсяго за пяць тысяч. Па такім жа кошце ідзе цыбуля, якраз пры нас жанчына забірае цэлы мех — «лішняй не будзе».

Каляровая сястра белакачаннай каштуе ў сярэднім 20 тысяч. Зусім няшмат на кірмашы моркавы, прадаюць яе па тры-чатыры тысячы. Часнок можна набыць за 10-15 тысяч. Зеляніну (зялёную цыбулю, пятрушку, кроп) аддаюць аднолькава — па пяць за пучок. А вось слуцкія буракі ідуць па восем тысяч за кілаграм. Гатунак «Бардо» з іншага рэгіёна каштуе танней — пяць тысяч.

Уражвае колькасць гарбузоў на прылаўках, кілаграм каштуе 15 тысяч. Балгарскія перцы можна набыць за 25 тысяч, чылі — даражэйшыя, аддаць давядзецца каля 80 тысяч.

Пераходзім да радоў з садавіной. Агрэсіўны маркетынг на адным з латкоў заклікае набыць «суперсалодкі яблык» — 12 тысяч рублёў. Не вельмі салодкі аддадуць і за 10. Груша родам з-пад Брэста каштуе 28 тысяч за кілаграм. Вінаград у залежнасці ад гатунку прадаюць за 20-25 тысяч. Дыня з Узбекістана — 13 тысяч. Кавун каштуе 4,5 тысячы за кіло, па словах гандляркі, беларуская паласатая ягада не горшая за панамскіх «сясцёр». Сярод ягад пераважаюць журавіны, кошт на іх ва ўсіх прадаўцоў аднолькавы — 40 тысяч за кілаграм.

Уражаныя асартыментам, аналізуем кантынгент — пераважаюць жанчыны пенсійнага і перадпенсійнага ўзросту. Як ім дацягнуць да дому пакупкі? Адказ чакае непадалёк — Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі арганізаваў для ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны і людзей сталага ўзросту бясплатную дастаўку.

Мы размаўляем з Арцёмам Кяшкіным, каардынатарам валанцёрскага руху БРСМ «Добрае сэрца». Хлопец кажа, што за чатыры гадзіны з пачатку гандлю маладыя людзі дапамаглі ўжо больш як трыццаці пакупнікам. Дзясятак актывістаў грузіць садавіну і гародніну ў аўтамабілі, давозяць да месца прызначэння, падымае ў кватэры. Некаторым ахвотным, праўда, даводзіцца пачакаць сваёй чаргі, бо колькасць «брыгад» абмежавана. Тым не менш больш за гадзіну стаяць не прыходзіцца. Па словах Арцёма, такія ж атрады будуць працаваць на кірмашах ва ўсіх раёнах сталіцы да канца кастрычніка.

Пэўна, на іншых пляцоўках дапамога валанцёраў будзе не так запатрабавана. Першае, што кідаецца ў вочы на кірмашы каля Лядовага палаца на вуліцы Прытыцкага, — пакупнікі больш маладога ўзросту, ёсць сем'і з дзецьмі. Відаць, жыхары найбліжэйшых дамоў сышліся «закупацца» на зіму. Гандаль ідзе нават больш актыўна. Кошты — аналагічныя тым, што мы бачылі каля Палаца спорту.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

■ АПК

# ПРАЦАВАЦЬ БЕЗ ДАЎГОЎ

**Ключавымі задачамі Мінсельгасхарча з'яўляецца паляпшэнне эканомікі сельскай гаспадаркі і павышэнне канкурэнтаздольнасці прадукцыі. Ужо сёння гэтыя напрамкі плануюць унесці ў праграму развіцця галіны да 2020 года. У ёй таксама прапануецца «аздаравіць» шэраг стратных сельгаспрадпрыемстваў, зняўшы з іх неабходнасць выканання даўгавых абавязацельстваў у кароткатэрміновай перспектыве.**

## ГАСПАДАРКІ ПЕРАСПЕЦЫЯЛІЗУЮЦЬ

**Міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Леанід ЗАЯЦ** падкрэсліў, што большую ўвагу ў наступнай пяцігодцы плануецца надаць стратным сельгаспрадпрыемствам, якіх па краіне каля 29%. Прычым у гэты спіс трапілі нават некалі лепшыя прадпрыемствы, напрыклад, агракамбінат «Ждановічы». Уся справа ў тым, што на многіх з іх адбывалася мадэрнізацыя, укараняліся новыя тэхналогіі, набывалася тэхніка, і цяпер яны нясуць сур'ёзную крэдытную нагрузку.

«Мы прапануем адтэрмінаваць на пэўны час даўгі, даць прадпрыемствам магчымасць стаць на ногі, зарабіць, каб потым яны маглі спакойна разлічыцца па сваіх крэдытных абавязацельствах. А тыя гаспадаркі, якія нават пасля гэтага не будуць мець магчымасці разлічыцца, прапануем ліквідаваць, папярэдне закрыўшы ўсе даўгі», — канстатаваў міністр.

Акрамя таго, Мінсельгасхарч будзе вырашаць пытанні з фермерамі. Напрыклад, слабыя гаспадаркі хутчэй за ўсё зменяць уласніка. Зямлю іншых будуць прапаноўваць фермерам у арэнду, з правам выкупу. Яшчэ адным важным момантам стане пераспецыялізацыя прадпрыемстваў.

«Гаспадаркі павінны займацца толькі тым, што ў іх атрымліваецца добра, на чым яны зарабляюць», — растлумачыў Леанід Заяц.

## МЯСА ДАРАЖЭЦЬ НЕ БУДЗЕ

Да канца года ў краіне плануецца ўвесці адзінаццаць новых свінакомплексаў. «Гэта дасць магчымасць стабілізаваць вытворчасць свініны ў аб'ёме 480-500 тыс. тон. Менавіта гэты аб'ём неабходны для ўнутранага спажывання», — адзначыў Леанід Заяц.

Прадпрыемствы Мінсельгасхарча за першыя восем месяцаў сёлета сфарміравалі станоўчае сальда гандлёвага балансу ў памеры 1,1 млрд долараў. Гэта адбылося дзякуючы таму, што сёлета павялічылі пагалоўе буйной рагатай жывёлы на 56 тыс. галоў, птушкі — на 3 млн галоў, свіней — на 330 тыс. галоў. Вытворчасць малака вырасла за студзень—жнівень у параўнанні з аналагічным перыядам летась на 7,3%, або на 304 тыс. тон. Назіраецца і рост яго рэалізацыі — плюс 8,8%.

«Мы рэалізавалі на 334 тыс. тон малака больш. Продаж малочнай прадукцыі павялічыўся на 24%, продаж мяса застаўся на ўзроўні мінулага года. Але выручка скарацілася на 17%, бо сусветныя кошты на малако і малочную прадукцыю рэзка знізіліся, па некаторых пазіцыях — на 50%», — растлумачыў міністр.

Ён таксама паведаміў, што сёлета надоі прагназуюцца на ўзроўні 4,7 — 4,8 т малака за год на карову. Вытворчасць мяса ў 2015 годзе на прадпрыемствах ведамства вырасла на 7,1%, або на 72,9 тыс. тон.

«Усё гэта дазволіла нам стварыць неабходны запас прадуктаў харчавання ўнутры краіны, каб забяспечыць наш харчовы рынак і даць магчымасць прадпрыемствам рэалізаваць астатнюю прадукцыю на рынкі Расіі і трэціх краін», — канстатаваў Леанід Заяц.

Акрамя таго, ён адзначыў, што закупачныя цэны на ялавічыну і свініну ў Беларусі зараз расці не будуць. У краіне ёсць рэзерв для зніжэння сабекошту мяса.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

■ Ведай нашых!

# «ДАЖЫНКІ» — НАШ БРЭНД

## У ТАЛАЧЫНЕ ПРАЙШЛО АБЛАСНОЕ СВЯТА ПРАЦАЎНІКОЎ ВЁСКІ

**Сёлета аграрыі Прыдзвінскага краю паставілі рэкорды. Упершыню за апошнія 40 гадоў сабралі каля 1 мільёна 440 тысяч тон збожжа, а сярэдняя ўраджайнасць дасягнула 36,6 цэнтнера з гектара. Больш за тое, вяскоўцы Віцебшчыны першымі ў краіне выканалі дзяржаўны заказ па пастаўках збожжа.**





Фота Аляксея СПАТКАЯ.

Рэкордная ўраджайнасць — 80,5 цэнтнера з гектара — у адкрытым акцыянерным таварыстве «Хацілы-Агра» Пастаўскага раёна.

— У чым сакрэт поспеху? У выкананні тэхналогій і выдатным надвор'і. А многія ж лічылі, што сёлета з прычыны засухі не будзе добрых вынікаў, — распавядае **кіраўнік гаспадаркі Вячаслаў КРЫШТАФОВІЧ.**

Першым «тысячнікам» і «двухтысячнікам» у вобласці на мінулым жніве быў экіпаж камбайна з гаспадаркі «Вусце» Аршанскага раёна.

— Мы з Дзмітрыем Бацюковым намалацілі больш за 2700 тон. Упершыню ў нас такі поспех. А на жніве працую ўжо гадоў восем. Так, сёлета працавалі напружана вельмі, як ніколі раней. Прыемна, што старанная праца добра аплачвалася. За месяц я зарабіў 25 мільёнаў рублёў, — распавядае **Сяргей СПАТКАЙ, старшы камбайнер гаспадаркі.**



Губернатар Віцебшчыны з караваем ураджаю 2015 года.

Вышэйзгаданыя перадавікі падчас ганаровай цырымоніі святкавання ўручылі губернатару каравай са жніва 2015 года.

— Аграрыі паўночнага рэгіёна краіны пераадолелі псіхалагічны бар'ер, зламалі стэрэатып і пераканаліся ў тым, што і на нашых землях можна атрымліваць высокія ўраджаі — на ўзроўні найлепшых гаспадарак рэспублікі. Сёння збожжа для Віцебшчыны стала экспартным таварам. Зерне становіцца прыбытковым. Мы ўпершыню атрымалі права рэалізаваць 100 тысяч тон збожжа за межы рэспублікі, — сказаў **старшыня Віцебскага аблвыканкама Мікалай ШАРСТНЁЎ.**

У святкаванні прымаў удзел і старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір Андрэйчанка. У сваім віншаванні ён выказаў думку, што «Дажынкі» сталі беларускім брэндам.

— Тыя, хто жадае ўбачыць сапраўдную Беларусь, павінны прыехаць у Талачын. Горад памаладзеў і змяніўся. Менавіта ў ім і іншых маленькіх гарадах і раёнах тая асаблівая атмасфера, якую сёння вельмі цяжка адчуць у гарадах вялікіх. Менавіта тут захоўваюцца нашы добрыя беларускія традыцыі, жывуць людзі, якія ўмеюць працаваць і весяліцца. Сённяшняе свята — гэта велізарная даніна павагі яго вялікасці хлебу і нялёгкай сялянскай працы, — сказаў **Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА.**

Ён разам з губернатарам і іншымі афіцыйнымі асобамі ўзяў удзел у цырымоніі адкрыцця гарадскога парку, які атрымаў другое жыццё. У ліку іншага цяпер там ёсць фантан з лірычнай назвай «Каханачка». Высокапастаўленыя госці наведалі рэканструяваныя бібліятэку, раённы цэнтр культуры народнай творчасці. Іх пачаставалі смачнай хлебабулачнай прадукцыяй — на першай у гісторыі абласных «Дажынак» «галерэі» караваяў. Там былі прадстаўлены нават карціны з цеста.

Свята пройдзе, а рэканструяваныя аб'екты грамадскага прызначэння, адрамантаваныя вуліцы, жылыя дамы застануцца на дзясяткі гадоў. У прыватнасці, медыцынская ўстанова ў Талачыне цяпер не горшая, чым у абласных цэнтрах.

— У нас запрацавала новае аддзяленне гемадыялізу. У ім змогуць абслугоўвацца жыхары і суседніх раёнаў. Падчас падрыхтоўкі да «Дажынак» праведзены рамонт падраздзялення дзіцячай кансультацыі бальніцы. Усяго асвоілі каля 10 мільярдаў рублёў, — распавядае **галоўны ўрач Талачынскай цэнтральнай раённай бальніцы Аляксей ВІШНЕЎСКІ.**

На «Дажынках» было шмат цікавага. На вуліцы адбыліся спаборніцтвы па барацьбе сярод сельскіх волатаў. Пераможца ў якасці прыза атрымаў быка. Працавалі «Горад майстроў», кірмашы, дзе ў ліку іншага можна было пакаштаваць стравы, прыгатаваныя па старажытных рэцэптах, у тым ліку юшку з пеўня... Свята завяршылася грандыёзным феерверкам.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*
*Талачын — Віцебск*

■ На свае вочы

# АПРАНУЦЦА З ГУСТАМ, або Чым нас хацелі ўразіць

**Шалікі з водарам, боты з партрэтам уладальніка, бялізна, якую не трэба прасаваць, і іншыя нечаканыя рэчы можна было сустрэць на выставе «БелТЭКСлегпрам. Восень-2015» у Мінску, дзе сабраліся прадстаўнікі больш як 140 кампаній з краін Беларусі, Расіі, Украіны, Польшчы, Турцыі і Узбекістана.**

Асартымент выставы ўразіў разнастайнасцю: адзенне, тканіна, сумкі, бялізна, купальнікі, абутак, вырабы прамысловасці, абсталяванне для фарбавання... У кожнай кампаніі была свая мэта: падпісаць кантракт ці знайсці дылера, заявіць пра сябе на рынку ці вывучыць, што патрэбна спажыўцам, уразіць навінкамі і эксклюзівам ці чарговы раз прэзентаваць вядомыя брэнды.

Кампанія «Трэнд Корнер» — вядомы пастаўшчык турэцкіх шалікаў з арыгінальным дызайнам — прывезла, напрыклад, летнюю калекцыю з водарам.

***— Шалік можна мыць да дзесяці разоў, а водар усё будзе трымацца. Дарэчы, у трэндзе гэтага сезона вінныя колеры, бардо і ярка-фіялетавы,*** — падзялілася прадстаўніца кампаніі.

А вось айчынная кампанія «Дарбарстор» выстаўляецца ўпершыню, хоць працуе з кліентамі ўжо пяць гадоў. Яны збіраюцца запоўніць у Беларусі нішу па стварэнні недарагога адзення максімальнай якасці і заяўляюць, што ў стане ажыццявіць гэта.



Індывідуальныя прадпрымальнікі не засталіся без увагі пакупнікоў.

***— Наша палітыка — не рабіць канкрэтных стылізаваных калекцый, а выбіраць апошнія еўрапейскія, англійскія, італьянскія тэндэнцыі і паводле іх ствараць свае вырабы. Гэта і сукенкі, і вопратка — усё, што цікавіць кліента,*** — расказаў прадстаўнік кампаніі. — ***Апошні год мы працуем ужо як самастойны брэнд, зарэгістраваны ва ўсіх краінах СНД, і цяпер нам цікавыя запатрабаванні беларускага кліента.***

Нягледзячы на тое, што выстава пазіцыянавалася як аптовая, набывалі ўпадабаныя рэчы і ў розніцу. Асабліва на стэндах з жаночым адзеннем ад айчынных прадпрымальнікаў і расійскай дзіцячай вопраткай кампаніі «Усё дзеткам!».

Увогуле, на выставе пры жаданні можна было адзецца з ног да галавы. Прадстаўлена было ўсё, пачынаючы ад эксклюзіўнай нацельнай бялізны і гарнітураў і заканчваючы футрам і ботамі. Дарэчы, пра боты. Усім вядомы «Белвест» здзівіў наведвальнікаў магчымасцямі малюнкавага эксклюзіву — на бот з дапамогай лазера цяпер можна нанесці любы арнамент, нават партрэт уладальніка рэчы.

На выставе можна было не толькі аднавіць гардэроб, але і набыць тавары для дома, айчынную сталовую і пасцельную бялізну. Апошнія навінкі ў сталіцу прывёз баранавіцкі вытворца хатняга тэкстылю «Блакіт».

Турэцкая кампанія «Ост анадулу Кімія» прэзентавала абсталяванне і фарбы для шаўкаграфіі. У яе асартыменце ўсе магчымыя віды фарбаў і хімічных дабавак: пластызолевыя, водныя, фарбы для вытраўкі, з бляскам.

***— Мы нават не чакалі такой цікавасці з боку беларусаў. Наша прадукцыя вельмі спадабалася вашым вытворцам — цяпер будзем выбіраць, каго зрабіць нашым эксклюзіўным дылерам на тэрыторыі Беларусі,*** — кажа супрацоўніца кампаніі.

Па выніках выставы несумненнымі лідарамі сталі прадпрыемствы Віцебскай вобласці, якія атрымалі ўзнагароды ў чатырох намінацыях з пяці.

**Ірына СІДАРОК. Фота аўтара**

■ Сустрэлася ў дарозе

# Паром на Выгаду



Адказны за перавозку на пароме (на думку матроса Пятра СІНКАЎЦА) заўжды павінен быць у выдатным настроі.



Паром адправіўся ў чарговы рэйс.




Шыльда з назвай вёскі «Выгада» сустракае на беразе канала.

Сярод беларускіх вёсак знойдзецца не адзін дзясятак з назвай «Выгада». Відаць, у нашых продкаў былі розныя падставы, каб даваць такое пазітыўнае імя сваім паселішчам.

Жыхары вёскі Выгада, што ў Кобрынскім раёне, маюць розныя версіі таго, адкуль паходзіць імя іх населенага пункта. Самай аргументаванай здаецца тая, якая абапіраецца на існаванне тут выгаднага транспартнага сродку. Сапраўды, для вяскоўцаў вельмі выгадна не шукаць лодку, не ехаць на далёкі мост цераз Дняпроўска-Бугскі канал, а прыйсці на маляўнічы бераг і, згодна з раскладам руху, пераплысці шырокую плынь на пароме.

Першы рэйс для тых, хто рана выходзіць з хаты — а палове сёмай. Апошні — для паўночнікаў. І так увесь час, акрамя тых дзён, калі плынь старога канала сцішаць зімовыя маразы.

Як на кожным транспартным сродку, на пароме ўсе падпарадкоўваюцца строгім правілам. Спачатку з прыстані на яго ўз'язджаюць аўтамабілі, матацыклы, вазы. Потым заходзяць пасажыры (ім забаронена перавозіць выбуховыя і вогненебяспечныя рэчы). Калі вы прыехалі на машыне — выйдзіце, калі ласка, пастойце на палубе. Асобны пункт у правілах для гаспадароў, якія прывялі з сабой жывёлу, прынеслі птушак. Перавозка свойскай жывёлы дазваляецца «толькі пры наяўнасці суправаджальнікаў», а «авечкі, козы і свінні павінны быць прывязанымі да бар'ернай агароджы».

Што не кажы, маленькаму парому адведзена вялікая роля ў будзённых справах вяскоўцаў. Паром — сціплае, але выгаднае звяно разгалінаванай транспартнай сістэмы, якая на Кобрыншчыне складаецца з выдатных аўтадарог, чыгункі, водных шляхоў, нафтаправода, газаправода...

Шкада, што сучасныя перамены ў клімаце шкодзяць гэтаму таннаму і вельмі патрэбнаму транспарту. Летняя спёка ўсё часцей паніжае ўзровень водных артэрый, а гэта азначае, што матросы паромаў маюць перспектыву часова заставацца на беразе.



Месца, дзе сустракаюцца водныя шляхі і аўтамабільныя дарогі, — тыя ж ростані. Таму каля прычала пасажыраў вітае ўпрыгожаны ручніком і кветкамі крыж з іконай Божай Маці.

Як бы там ні было, але прафесія матроса парома па сёння патрэбная.

**Яўген ПЯСЕЦКІ.**
**Фота аўтара**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки»,** г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703 |
| Продавец | **ООО «Домашние окна»,** Брестская область, Пинский р-н, д. Заполье, ул. Мирная, 28 |
| Месторасположение предмета аукциона | Брестская область, Лунинецкий р-н, г. Лунинец, ул. Красная, 179/3 |

**Предмет аукциона (имущество реализуется одним лотом)**

| Наименование | Назначение | Инвентарный номер | Общая площадь |
|---|---|---|---|
| Бытовые помещения корпуса магнитопровода | Здание административно-хозяйственное | 133/С-13309 | 4234 кв.м |
| Незавершенное законсервированное капитальное строение (готовность строения 37%) | Здание неустановленного назначения | 150/U-20665 | 31840,7 кв.м |

| | |
|---|---|
| Сведения о земельном участке | Предоставлен продавцу для обслуживания зданий на праве **постоянного пользования** земельный участок площадью **4,5064** га. Ограничения прав: участок площадью 0,0337 га – охранная зона сетей и сооружений канализации, участок площадью 0,0638 га – охранная зона линий электропередачи напряжением 110 кВ |

**Начальная цена с НДС 20% – 5 880 000 000 белорусских рублей**

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с №3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в евро (EUR) – 3012343265060; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после подписания договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

| | |
|---|---|
| Дата и время проведения аукциона | **10.11.2015 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| Дата и время окончания приема документов | **09.11.2015 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».** |
| Контактные телефоны | **Тел: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71. E-mail: auction@cpo.by** |

## Бобруйское управление филиала «Центр «Белтехинвентаризация» оказывает услуги по:

- оценке имущества (недвижимость, транспорт, оборудование)
- организации и проведению аукционных торгов
- инвентаризации и оценке зеленых насаждений

**ФИЛИАЛ «ЦЕНТР «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ:**
**23 октября 2015 г. в 11.00 состоится ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН по продаже недвижимого имущества, принадлежащего на праве собственности ОАО «Белшина», в составе:**
**Лота № 1 (предмет торгов): Незавершенное законсервированное капитальное строение с инвентарным номером 730/U-15754 (здание административно-хозяйственного назначения) общей площадью 7458,0 кв.м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Кричев, ул. Трудовая, 1**

| | |
|---|---|
| Организатор торгов | Филиал «Центр «Белтехинвентаризация», УНП 102353509 (220034, г. Минск, ул. Чапаева, д. 4, к. 222, (р/с 3012105618108 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минска МФО 153001369, ОКПО 55484006) |
| Продавец предмета торгов | Открытое акционерное общество «Белшина», УНП 700016217, Минское шоссе, 213824, г. Бобруйск, Могилевская область |
| Место проведения торгов и подачи документов | г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 в здании Бобруйского управления филиала «Центр «Белтехинвентаризация» |
| Начальная цена продажи, рублей без НДС | 1 (Одна) базовая величина, определенная законодательством, задаток – в размере **одной базовой величины**, определенной законодательством |
| Номер расчетного счета для перечисления задатка | Получатель платежа ОАО «Белшина» – р/с 3012000003446 в ОАО «СБ Беларусбанк» г. Бобруйск, код 760, УНП 700016217, ОКПО 147621337000 |
| Информация о земельном участке | Земельный участок, расп. по адресу: Могилевская обл., г. Кричев, ул. Трудовая, 1, общ. пл. – 0,3488 га, состоит: участок № 1 с кадастр. номером 724050100001005539 пл. – 0,3478 га, участок № 2 с кадастр. ном. 724050100001005540 пл. – 0,0005 га, участок № 3 с кадастр. номером 724050100001005541 пл. – 0,0005 га, правовой режим – право постоянного пользования, правообладатель – ОАО «Белшина» |

**Характеристика предмета торгов**

здание административно-хозяйственное – стены ж/б плиты, частич. кирпич, фундамент ж/б, перекрытия ж/б, крыша совмещ. рулонная, полы бетон., степень гот. – 93%; санитарно-техн. устройства: отопление – стал. трубы. част. пластинчатые батареи, степень гот. – 30%; водопровод – част.стал. трубы, степень гот. – 30%; канализация – част. чугун. трубы, степень гот. – 30%, электроосвещение – част. скрытая проводка, степень гот. – 50%, крыльцо – ж/б перекрытие на метал. опорах

| | |
|---|---|
| Условия продажи | При заключении договора купли-продажи между продавцом и покупателем (претендентом на покупку) на цену продажи предмета торгов будет начислен НДС по ставке 20% |
| Срок заключения договора купли-продажи | В течение 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона |
| Условия оплаты | Определяются по согласованию Победителя торгов с Собственником имущества при заключении договора купли-продажи |
| **Срок подачи документов, осмотра объектов и внесения задатка** | По 21 октября 2015 г. включительно до 16.00 |

**Победитель (претендент на покупку)** возмещает затраты на организацию и проведение торгов не позднее 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукционных торгов на основании счета-фактуры, выдаваемой Организатором торгов.

****Более подробная информация об условиях участия в торгах, перечне документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах, опубликована в газете «Рэспубліка» от 20 июня 2014 г.**

**Получить доп. информацию о продаже имущества можно по адресу: г. Бобруйск, ул. Чонгарская, 54 или связавшись с нами по телефонам: 8 (0225) 72 01 32, 72 13 93, 8 (044) 710-50-85 в рабочие дни с 8.30 до 17.00**

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении 12 ноября 2015 г. торгов по продаже имущества, на которое обращено взыскание в счет неисполненного налогового обязательства, неуплаченных пеней

| | |
|---|---|
| Предмет торгов (наименование, характеристики, местонахождение продаваемого имущества) | Изолированное помещение (административное помещение), расположенное по адресу: г. Минск, ул. Нововиленская, 38, помещение 6 общей площадью 18,3 м² (инвентарный номер в ЕГРНИ 500/D-708025125; наименование: административное; назначение: административное помещение) |
| Местонахождение имущества | г. Минск, ул. Нововиленская, 38, помещение 6 |
| Начальная цена | 291 432 000 рублей |
| Сумма задатка | 29 000 000 рублей |
| Организатор аукциона | УП «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, комн. 10, |
| Балансодержатель (должник) | БП СП ООО «Бокемин» |

**Организатор аукциона – УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.**

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 04.09.2006 № 559, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, представившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

*Задаток перечисляется на расчетный счет №3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369; получатель – УП «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583. Сумма задатка для участия в аукционе должна быть внесена в срок, установленный для приема документов.*

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона. Информация о размере затрат доводится до сведения участников перед началом аукциона.

Аукцион проводится **12 ноября 2015 г. в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 12.10.2015 по 09.11.2015 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок: (017) 327-40-22, (017) 327-48-36 – УП «Минский городской центр недвижимости».**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА С ПОНИЖЕНИЕМ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ

**Предыдущее извещение о проведении аукциона было опубликовано в газете «Звязда» от 02.09.2015**

### ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА с понижением начальной цены на 20%

***Аукцион проводится в соответствии с действующим законодательством и Положением ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» «О порядке организации и проведения аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей»***

| | |
|---|---|
| Предмет аукциона (сведения о продаваемом имуществе, характеристики) | *Наименование (назначение)* – **Здание многофункциональное**. Адрес объекта – **г. Минск, ул. Куйбышева, 19А.** *Характеристики* – капитальное строение с инвентарным номером 500/С-1381 – отдельно стоящее трехэтажное кирпичное здание, 1993 г. постройки **общей площадью 612,5 м.кв.**, площадь застройки – 181,0 м кв., расположенное на земельном участке площадью 0,0360 га, предоставленном на праве постоянного пользования для эксплуатации и обслуживания здания производственного корпуса (кадастровый номер – 500000000007000740). Объект имеет обременения в виде договоров аренды. Условия дальнейшего использование объекта – в соответствии с регламентом генерального плана г. Минска |
| Начальная цена предмета аукциона (в т.ч. НДС 20%) | Сумма, эквивалентная **665 255 долларам США** |
| Задаток | Сумма, эквивалентная **66 525 долларам США** |
| Шаг аукциона | 5% |
| Сведения об оргнизаторе торгов, его местонахождении и контактные телефоны | ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» 220029, г. Минск, ул. Красная, д. 7, пом. 1, каб. 25, тел.: 8 017 286 78 59, факс: 8 017 286 76 80 |
| Сведения о продавце, его местонахождении и контактные телефоны | ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» 220029, г. Минск, ул. Красная, д. 7, пом. 1, каб. 25, тел.: 8 017 286 78 59, факс: 8 017 286 76 80 |
| Срок подписания договора купли-продажи | Договор купли-продажи должен быть заключен в течение **10 (десяти) календарных дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона |
| Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона | Победитель аукциона в течение **10 (десяти) календарных дней** со дня утверждения протокола о результатах аукциона обязан возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение на основании счета, выставленного организатором аукциона |
| Условия оплаты | Оплата стоимости приобретенного на аукционе объекта осуществляется в срок, который будет установлен в договоре купли-продажи. Оплата задатка и лота производится резидентами в белорусских рублях по курсу Национального банка Республики Беларусь на день платежа на следующие банковские реквизиты: р/с 3012000790020 в ОАО «Банк БелВЭБ», код 226 г. Минск, пр-т Победителей, 29. Открытое акционерное общество «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ», УНН 101059240, ОКПО 37392696. Оплата задатка и лота производится нерезидентами в долларах США или в белорусских рублях по курсу Национального банка Республики Беларусь на день платежа на следующие банковские реквизиты: Сч./Асс.: 3012000790020 (BYR); Сч./Асс.: 3012000790003 (USD) SWIFT CODE: BELBBY2X ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, пр-т Победителей, 29 БИК: 153001226 Банк корреспондент CITIBANK N.A., NEW YORK SWIFT CODE: CITIUS33 Acc.36249772. Открытое акционерное общество «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ». УНН 101059240. ОКПО 37392696. Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты за объект, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона |
| Место, дата и время приема заявлений на участие в аукционе | Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются **до 15 октября** в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Красная, д. 7, пом. 1, каб. 312 |
| Место, дата и время проведения аукциона | Аукцион состоится **20 октября 2015 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Красная, д. 7, пом. 1, зал совещаний ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» |

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах регламентирован Положением ОАО «Управляющая компания холдинга «ГОРИЗОНТ» «О порядке организации и проведения аукционов по продаже капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей», размещенном на сайте **www.horizont-group.com, раздел «Аренда: Аукционы»**

**Дополнительная информация по тел.: +375 17 284 94 32; +375 29 239 39 64, 375 44 580 63 02. E-mail: tushinskaya@horizont.bn.by, www.horizont-group.com, раздел «Аренда: Аукционы»**

## Ровенская товарная биржа

Украина, г. Ровно, ул. Драгоманова, 27, +380362620524, +380362620588

### извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества иностранного предприятия «Томашгородский КДЗ» с понижением начальной цены

| | | | Начальная цена с НДС, доллары США | Задаток с НДС, доллары США | Шаг аукциона, % |
|---|---|---|---|---|---|
| Лот №1 | Имущество ИП «Томашгородский КДЗ» | Украина, Ровенская обл., Рокитновский р-н, пгт. Томашгород, ул. Заводская, 3 | **360 000** | 36 000 (подлежит уплате в гривнах по курсу НацБанка Украины на дату платежа) | 5 |

**С перечнем объектов недвижимости, основных средств, малоценных необоротных материальных активов можно ознакомиться в извещениях, размещенных в газете «Звязда» от 14.03.2015, 11.04.2015, 20.05.2015, 06.08.2015, 02.09.2015)**

С информацией о земельном участке, условиями проведения аукциона, порядке и сроках перечисления гарантийного взноса (задатка) и его возврата, условиях участия в аукционе можно ознакомиться в извещении, размещенном в газете «Звязда» от 14.03.2015, от 11.04.2015, 20.05.2015, 06.08.2015, 02.09.2015.

**Аукцион состоится 30.10.2015 в 10.00 по адресу: ул. Заводская, 1, г. Фаниполь, Дзержинский р-н, Минская обл., Республика Беларусь, 222750. Помещение актового зала ОАО «Дорстройиндустрия».**

*Гарантийный взнос (задаток) перечисляется на р/с 26009705953117 в АТ Райффайзен банк «Аваль», г. Ровно, ул. С.Петлюры, 35, МФО 380805, получатель – Ровенская товарная биржа, код ЄДРПОУ 23302583 (УНП). Назначение платежа: гарантийный взнос для участия в аукционе по продаже имущества иностранного предприятия «Томашгородский КДЗ» (Лот №1),* **проводимом 30 октября 2015 года.**

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.00 до 16.30 по адресу: Украина, г. Ровно, ул. Драгоманова, 27, помещение Ровенской товарной биржи.

Окончание приема заявлений и других необходимых документов – **27.10.2015 в 17.00**.

Заключительная регистрация участников 30.10.2015 с 09.30 до 10.00 по месту проведения аукциона.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом (Объектами). Контактное лицо для осмотра Объекта (Объектов): Поляк Владимир Филиппович, +38050 434 45 58.

**☎ Организатор: +380362620524, +380362620588 • e-mail: rtb@rivne.com**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА (ПОНИЖЕНИЕ ЦЕНЫ НА 20%) по продаже имущества ОАО «Хоневичи»

| | | | |
|---|---|---|---|
| Предмет торгов, краткая характеристика | **Лот №1** **Капитальное строение с инв. № 413/С-20736** (здание основного корпуса кирпичного завода) общей площадью 1297,3 кв.м, кирпичное, одноэтажное, 1948 г.п., составные части и принадлежности – пристройка | | |
| Местонахождение имущества | Гродненская обл., Свислочский р-н, Свислочский с/с, д. 23, около д. Гончары | | |
| Информация о земельном участке | Имущество расположено на земельном участке площадью 1,0 га с кадастровым номером 425282400001000110, назначение – для размещения объектов иного назначения (для обслуживания здания основного производственного корпуса кирпичного завода). Ограничения (обременения) прав: земельный участок, расположенный в охранной зоне линий электропередачи (0,1320 га). Имущественные права – право аренды по 02.02.2065 год. | | |
| Начальная цена | **452 064 000 рублей с учетом НДС** | **Сумма задатка** | **22 603 200 рублей** |
| Сведения о продавце | ОАО «Хоневичи», Гродненская обл., Свислочский р-н, а/г Хоневичи, ул. Школьная, 1, тел. 8(01513) 23686 | | |
| Сведения об организаторе торгов и номер счета для перечисления задатка | Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел. 8(0152) 74 49 11, р/с 3015575033025 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, г. Гродно, ул. Мицкевича, 3, код 739, УНП 500481906 | | |
| Срок заключения договора купли-продажи | В течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о проведении торгов | **Условия оплаты** | Определяются по согласованию сторон |
| **Торги состоятся 20 октября 2015 года в 12.00 часов по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8** | | | |
| Срок подачи документов для участия в торгах | **по 14 октября 2015 года включительно до 16.00 часов по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8** | | |
| **Условия участия и порядок проведения аукциона размещены на сайте организатора торгов www.fincentr.by** | | | |
| Дополнительная информация по телефонам: 8(0152) 74 49 11, 77 23 79 | | Предыдущая публикация: газета «Звязда» от 21.08.2015 года | |

## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) и стоимость имущества | **Лот № 1. Коровы основного стада в количестве 8 голов общим живым весом 3145 кг. Первоначальная стоимость – 54 924 280 белорусских рублей** |
| Собственник (владелец) имущества | ОАО «Межаны», УНН 300012548 |
| Местонахождение (адрес) имущества | Браславский район, д. Межаны |
| Информация об обременениях | Договор залога ОАО «Белагропромбанк» |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | г. Витебск, ул. «Правды», 32 29 октября 2015 года в 14.30 |
| Справочная информация | Главное управление юстиции Витебского облисполкома 210101, г. Витебск, ул. «Правды», д. 34 Судебный исполнитель Железовский Юрий Александрович, тел./факс: 8(0212) 600817, 8(033) 6879163 |
| Условия и порядок проведения торгов | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001037 в 200-м филиале ОАО «СБ Беларусбанк», МФО 635, УНП 300002505, не позднее 28.10.2015. Минимальная величина первого шага – 5% стоимости каждого лота. В соответствии с ч. 3 ст. 401 ХПК Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги |

## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) и стоимость имущества | **Лот № 1. Бычки на откорме в количестве 118 голов общим живым весом 28 200 кг. Первоначальная стоимость – 489 298 200 белорусских рублей** |
| Собственник (владелец) имущества | ОАО «Новая Гвардия», УНН 300060161 |
| Местонахождение (адрес) имущества | Браславский район, д. Богино |
| Информация об обременениях | Договор залога ОАО «Белагропромбанк» |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | г. Витебск, ул. «Правды», 32 29 октября 2015 года в 11.30 |
| Справочная информация | Главное управление юстиции Витебского облисполкома 210101, г. Витебск, ул. «Правды», д. 34 Судебный исполнитель Железовский Юрий Александрович, тел./факс 8(0212) 600817, 8(033) 6879163 |
| Условия и порядок проведения торгов | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001037 в 200-м филиале ОАО «СБ Беларусбанк», МФО 635, УНП 300002505, не позднее 28.10.2015. Минимальная величина первого шага – 5% стоимости каждого лота. В соответствии с ч. 3 ст. 401 ХПК Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги |

## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) и стоимость имущества | **Лот № 1 Телки воспроизводства в количестве 8 голов общим живым весом 3 329 кг. Первоначальная стоимость – 45 377 599 белорусских рублей** |
| Собственник (владелец) имущества | ОАО «Ольшанка», УНН 300060118 |
| Местонахождение (адрес) имущества | Браславский район, д. Плюсы |
| Информация об обременениях | Договор залога ОАО «Белагропромбанк» |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | г. Витебск, ул. «Правды», 32 26 октября 2015 года в 11.30 |
| Справочная информация | Главное управление юстиции Витебского облисполкома 210101, г. Витебск, ул. «Правды», д. 34 Судебный исполнитель Железовский Юрий Александрович, тел./факс: 8(0212) 600817, 8(033)6879163 |
| Условия и порядок проведения торгов | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001037 в 200-м филиале ОАО «СБ Беларусбанк», МФО 635, УНП 300002505, не позднее 25.10.2015. Минимальная величина первого шага – 5% стоимости каждого лота. В соответствии с ч. 3 ст. 401 ХПК Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) и стоимость имущества | **Лот № 1. Бычки на откорме в количестве 5 голов общим живым весом 1 790 кг. Первоначальная стоимость – 31 260 560 белорусских рублей. Лот № 2. Телята высшей упитанности в количестве 8 голов общим живым весом 3 435 кг. Первоначальная стоимость – 59 988 840 белорусских рублей.** |
| Собственник (владелец) имущества | ОАО «Березовый край», УНН 300060146 |
| Местонахождение (адрес) имущества | Браславский район, д. Пеликаны, |
| Информация об обременениях | Договор залога ОАО «Белагропромбанк» |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | г. Витебск, ул. «Правды», 32 26 октября 2015 года в 14.30 |
| Справочная информация | Главное управление юстиции Витебского облисполкома 210101, г. Витебск, ул. «Правды», д. 34 Судебный исполнитель Железовский Юрий Александрович, тел./факс 8(0212) 600817, 8(033)6879163 |
| Условия и порядок проведения торгов | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001037 в 200-м филиале ОАО «СБ Беларусбанк», МФО 635, УНП 300002505, не позднее 25.10.2015. Минимальная величина первого шага – 5% стоимости каждого лота. В соответствии с ч. 3 ст. 401 ХПК Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ в г. Сморгони Гродненской области в частную собственность

| Номер лота | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
|---|---|---|---|---|---|
| Адрес земельного участка, кадастровый номер | г. Сморгонь, ул. Полевая, У-40А, 425650100001004805 | г. Сморгонь, проезд Романтиков, У-15А, 425650100001004807 | г. Сморгонь, проезд Романтиков, У-14А, 425650100001004806 | г. Сморгонь, проезд Романтиков, У-20А 425650100001004812 | г. Сморгонь, проезд Романтиков, У-21А 425650100001004813 |
| Целевое назначение земельного участка | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | | | | |
| Назначение земельного участка | размещение объектов усадебной застройки (строительство и обслуживание жилого дома) | | | | |
| Право на земельный участок | право частной собственности | | | | |
| Площадь, га | 0,1344 | 0,1312 | 0,1312 | 0,1310 | 0,1332 |
| Начальная цена земельного участка, руб. | **119 230 863** | **116 392 033** | **116 392 033** | **116 214 606** | **118 166 302** |
| Задаток, руб. | **11 923 100** | **11 639 200** | **11 639 200** | **11 621 500** | **11 816 600** |
| Дополнительное условие* | возместить затраты: изготовление землеустроительного дела по созданию земельного участка в сумме 7 384 703 рубля; за государственную регистрацию создания земельного участка, возникновения прав на него 663 600 рублей; изготовление градостроительного паспорта земельного участка в сумме 2 937 979 рублей | | | | |

| Номер лота | 6 | 7 | 8 | 9 |
|---|---|---|---|---|
| Адрес земельного участка, кадастровый номер | г. Сморгонь, ул. Франциска Скорины, У-7А 425650100001004821 | г. Сморгонь, ул. Франциска Скорины, У-8А 425650100001004822 | г. Сморгонь, ул. Франциска Скорины, У-9А 425650100001004823 | г. Сморгонь, ул. Франциска Скорины, У-1А 425650100001004818 |
| Целевое назначение земельного участка | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | | | |
| Назначение земельного участка | размещение объектов усадебной застройки (строительство и обслуживание жилого дома) | | | |
| Право на земельный участок | право частной собственности | | | |
| Площадь, га | 0,1304 | 0,1303 | 0,1306 | 0,1314 |
| Начальная цена земельного участка, руб. | **115 682 326** | **115 593 612** | **115 859 753** | **116 569 460** |
| Задаток, руб. | **11 568 200** | **11 559 400** | **11 586 000** | **11 656 900** |
| Дополнительное условие* | возместить затраты: изготовление землеустроительного дела по созданию земельного участка в сумме 7 384 703 рубля; за государственную регистрацию создания земельного участка, возникновения прав на него 663 600 рублей; изготовление градостроительного паспорта земельного участка в сумме 2 937 979 рублей | | | возместить затраты: изготовление землеустроительного дела по созданию земельного участка в сумме 7 427 701 рубля; за государственную регистрацию создания земельного участка, возникновения прав на него 663 600 рублей; изготовление градостроительного паспорта земельного участка в сумме 2 937 979 рублей |

** Для победителя аукциона либо единственного участника несостоявшегося аукциона не позднее дня утверждения акта приемки одноквартирного жилого дома в эксплуатацию возместить затраты на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельному участку в соответствии с Положением о порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в том числе проектирование объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к такому земельному участку, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 1 апреля 2014 года № 298.*

**1. Аукцион состоится 11 ноября 2015 года в 11.00** по адресу: 231000, г. Сморгонь, ул. Ленина, 5. Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Сморгонь, ул. Ленина, 5, каб. 302 в рабочие дни с 8.00 до 17.00.

Телефон для справок в г. Сморгонь: 8 01592 3 23 91.

Последний день подачи заявлений – **6 ноября 2015 г. до 13.00**.

**2**. **Организатор аукциона** – Сморгонский районный исполнительный комитет, 231000, г. Сморгонь, ул. Ленина, 5 (время работы с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00, кроме выходных и праздничных дней), тел.: (8-01592) 32391, 42190.

**3**. Желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с земельными участками (тел.: 801592, 32341, 31723).

4. Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

**5. Для участия в аукционе гражданин, юридическое лицо** (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный в извещении срок подают заявление об участии в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые они желают приобрести в частную собственность, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на расчетный счет 3641526001461 в АСБ «Беларусбанк», код банка 504, УНП 500108328, получатель платежа – Сморгонский райисполком заверенную банком копию платежного поручения о внесении суммы задатка, указанной в извещении, с отметкой банка, а также заключают с местным исполнительным комитетом или по его поручению с организацией соглашение.

**Кроме того, в комиссию или организацию представляются**:

*гражданином* – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

*представителем гражданина* – нотариально удостоверенная доверенность;

*представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица* – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

Консолидированными участниками для участия в аукционе представляются также оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц – документ, удостоверяющий личность. При подаче документов уполномоченное лицо (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные гражданами, юридическими лицами, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия должностного лица.

**Сумма расходов на опубликование извещения в республиканском издании будет добавлена победителям аукциона согласно счет-фактуре.**

**Граждане, юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.**

**Платеж за земельный участок осуществляется единовременно (без предоставления рассрочки) по безналичному расчету в расчетных билетах Национального банка Республики Беларусь.**

## БЕЛАРУСБАНК

**ОАО «АСБ Беларусбанк» информирует о продлении срока размещения облигаций банка 179-181 выпусков, номинированных в белорусских рублях, по 04.04.2017.**

Изменения в эмиссионные документы указанных выпусков зарегистрированы Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь 02.10.2015.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 24.05.2013, выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества и его стоимость | **Лот №1.** Объект недвижимости – капитальное строение с инвентарным номером 200/С-42643, расположенное по адресу: г. Витебск, ул. Журжевская, д. 17, год постройки – 1975, площадь постройки – 351 кв.м, общая площадь – 352,4 кв.м, назначение – двухэтажное кирпичное здание гаража, фундамент – железобетонный, стены – кирпичные, перекрытия – железобетонные, перегородки – кирпичные, крыша – рубероидная, полы – дощатые, бетонные, внутренняя отделка – оштукатурено, водопровод – есть, электроосвещение – открытая проводка, канализация – есть, начальная стоимость лота 655.800.000 белорусских рублей. |
| Собственник (владелец) имущества | Витебская область. Право собственности: Абросимов Александр Юрьевич |
| Местонахождение имущества | г. Витебск По всем вопросам, касающимся осмотра имущества, обращаться к Сорокину Алексею Викторовичу, г. Витебск, ул. Гагарина, д. 11, каб. 312 (раб. тел. 8029-715-14-66). |
| Наличие обременений | Нет |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома г. Витебск, ул. «Правды», 32, каб. 316 30 октября 2015 года в 10.00 |
| Справочная информация об организаторе торгов | Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома 210029, г. Витебск, ул. «Правды», д. 32, каб. 316 Судебный исполнитель Колядко Александр Михайлович, тел. (0212) 60 00 92, т.м. 37533-687-91-20 Начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович, тел. (0212) 60 09 75 |
| Условия и порядок проведения торгов | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества на депозитный счет отдела принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома, №3642903001037 филиала № 200 – Витебского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505 не позднее 14.00 29 октября 2015 года. Минимальная величина первого шага торгов – 5% стоимости лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) и стоимость имущества | **Лот № 1. Телки в количестве 8 голов общим живым весом 3 074 кг. Первоначальная стоимость – 53 684 336 белорусских рублей** |
| Собственник (владелец) имущества | ОАО «Браславский райагросервис», УНН 300060253 |
| Местонахождение (адрес) имущества | Браславский район, д. Ахремовцы |
| Информация об обременениях | Договор залога ОАО «Белагропромбанк» |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | г. Витебск, ул. «Правды», 32 26 октября 2015 года в 16.00 |
| Справочная информация | Главное управление юстиции Витебского облисполкома 210101, г. Витебск, ул. «Правды», д. 34 Судебный исполнитель Железовский Юрий Александрович, тел./факс: 8(0212) 600817, 8(033) 6879163 |
| Условия и порядок проведения торгов | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001037 в 200-v филиале ОАО «СБ Беларусбанк», МФО 635, УНП 300002505, не позднее 25.10.2015. Минимальная величина первого шага – 5% стоимости каждого лота. В соответствии с ч. 3 ст. 401 ХПК Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги |

## ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ ООО «Датч Стар»

**опубликованной в газете «Звязда» 26.09.2013 г. № 181, строительства многоквартирного жилого дома с подземной гараж-стоянкой (№ 1 по генеральному плану в квартале пр. Дзержинского – ул. Щорса – ул. Железнодорожная – ул. Хмелевского) со встроенными объектами обслуживания населения:**

«...стоимость 1 кв.м для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий, квартир площадью **71,87 кв.м**, на 11-м этаже – **1350 (одна тысяча триста пятьдесят) долларов США;** площадью **71,79 кв.м** на 15-м этаже – **1200 (одна тысяча двести) долларов США;** площадью **89,84 кв.м** на 7-м этаже – **1310 (одна тысяча триста десять) долларов США».**

**Дополнительную информацию можно получить по адресу: г. Минск, ул. Немига, 40, офис 704. Тел. 8 (017) 306 20 90, Vel.: 8 (029) 380 26 80, 8 (044) 781 81 17.**

УНП 191061436

Краіна здароўя

Выпуск № 17 (347)

■ Вы прасілі расказаць

# Дапаможа... соль

**Спелеатэрапія — лячэнне органаў дыхання мікракліматам саляных пячор, шахт, руднікоў — прымяняецца ўжо больш за 150 гадоў. Праўда, толькі ў апошнія дзесяцігоддзі прагрэс дазволіў навукова абгрунтаваць гэты кірунак. Дарэчы, высокая эфектыўнасць лячэння органаў дыхання ў саляных пячорах і абмежаваныя магчымасці прымянення такой тэрапіі абумовілі нараджэнне галатэрапіі — стварэнне наземных памяшканняў са штучным мікракліматам, блізкім па параметрах да лячэбнага асяроддзя спелеалячэбніц.**

У такіх памяшканнях — галакамерах — выкарыстоўваюць сухі аэразоль хларыду натрыю (кухоннай солі). Аэразоль хларыду натрыю здольны глыбока пранікаць у дыхальныя шляхі і аказваць карыснае шматбаковае ўздзеянне — супрацьзапаленчае, антыбактэрыяльнае і інш. Дыхальная функцыя ў выніку істотна паляпшаецца, выздараўленне паскараецца.

Паводле слоў **загадчыцы аддзялення медыцынскай рэабілітацыі 3-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі г. Мінска Любові ЛАНСКОЙ**, галатэрапія можа прымяняцца асобна або разам з медыкаментознай тэрапіяй, паколькі спалучаецца практычна з усімі лекамі, якія прымяняюцца ў пульманалогіі. Яе таксама камбінуюць з рознымі відамі фізіятэрапіі, масажу, лячэбнай фізкультуры і рэфлексатэрапіі.

### Нельга!

Пры абвастрэнні захворванняў бронхаў і лёгкіх, грыпе, вострых рэспіраторных вірусных інфекцыях з ліхаманкай і інтаксікацыяй, перанесеным туберкулёзе лёгкіх, артэрыяльнай гіпертэнзіі 2-3-й ступені, хранічнай каранарнай недастатковасці, вострых і хранічных захворваннях нырак, наяўнасці або падазрэнні на новаўтварэнні.



### Як прымаць працэдуру?

1. Гігіенічныя патрабаванні такія, што неабходна апранаць спецыяльны халат і бахілы.
2. Адзенне павінна быць свабодным, не сціскаць, не абцяжарваць дыханне.
3. Неабходна знаходзіцца ў стане абсалютнага спакою. Нельга размаўляць або чытаць.
4. Сеанс трэба праходзіць праз 1 гадзіну пасля ежы або фізічнай нагрузкі.
5. Пры захворваннях носа, прыдатачных пазух удых і выдых трэба рабіць праз нос. Пры захворваннях глоткі, гартані і бронхаў пасля павольнага глыбокага ўдыху неабходна затрымаць дыханне, а пасля зрабіць выдых — вельмі павольна асобнымі порцыямі з часовымі (секунднымі) перапынкамі паміж імі.
6. Час працэдур можна павялічваць ад сеанса да сеанса — ад 15 да 45 хвілін (да 3-4-га сеанса).
7. Рэкамендуецца прайсці 10-20 працэдур штодня або праз дзень.

Паўторныя курсы рэкамендуецца праводзіць праз 4-6 месяцаў, пры бранхіяльнай астме — праз 2-4 тыдні.

### Пры якіх захворваннях можа прымяняцца?

- Пнеўманія, мукавісцыдоз, бронхаэктатычная хвароба, бранхіяльная астма, бранхіт.
- Рыніт, сінусіт, адэноідыт, фарынгіт.
- Экзэма, алергадэрматоз, гняздовая алапецыя.

**Для прафілактыкі:**

схільным да хранічнай бранхіяльнай паталогіі, пры палінозе ■

■ Эстэтычная праблема

# ЯК ЛЯЧЫЦЬ... НЕВЫЛЕЧНЫ ПСАРЫЯЗ?

**Многія вядомыя людзі, напрыклад, Сталін, Ракфелер, Чэрчыль, пакутавалі ад захворвання, прычыны якога дагэтуль канчаткова не ўстаноўлены. Адным з самых распаўсюджаных захворванняў скуры з'яўляецца псарыяз, або лускаваты лішай. Штогод колькасць такіх хворых павялічваецца на 17 працэнтаў.**

— Для гэтага хранічнага захворвання скуры, пазногцяў і суставаў характэрны сып і ружовыя бляшкі, пакрытыя белымі лускамі, — кажа **ўрач-дэрматолаг, загадчыца аддзялення медыцынскай рэабілітацыі Мінскага гарадскога клінічнага скурна-венералагічнага дыспансера Таццяна КРЫШТОПЕНКА.** — Абвастраецца найчасцей восенню і зімой, але ў некаторых і летам. Гэтыя бляшкі могуць узнікаць і размяшчацца ў любым месцы скуры — на валасістай частцы галавы, далонях, падэшвах, палавых органах і г.д. Пашкоджанне скуры можа быць нават татальным. Псарыяз бывае як у груднічкоў, так і ў старых, аднак часцей выяўляецца ў 18-20-гадовых дзяўчат і юнакоў.

Псарыяз лічыцца спадчынным захворваннем з цэлым комплексам прычын — імуналагічныя зрухі, парушэнне абмену рэчываў, эндакрынныя і неўралагічныя расстройствы, стрэс.

Звычайна навакольныя баяцца заразіцца ад такіх хворых. Але гэта беспадстаўныя страхі, бо псарыяз — гэта не інфекцыя.



**Што можа справакаваць абвастрэнне?** Алкаголь (піва, шампанскае, моцныя спіртныя напоі). Яшчэ шакалад або прадукты, якія змяшчаюць воцат, перац. Галоўны сімптом — сверб, які будзе мацнейшы там, дзе больш бляшак.

Псарыяз можа слабець без нейкай асаблівай прычыны, але ніколі не знікне канчаткова. Часта пашкоджваюцца гэтым захворваннем і пазногці на руках, нагах (пры гэтым скура можа быць чыстай) — яны патаўшчаюцца, пад пазногцевай пласцінай з'яўляюцца чырванаватыя плямы.

Лячэнне скіравана на падаўленне запаленчай рэакцыі скуры. Трэба разумець, што нават пры пераходзе ў схаваны стан хвароба ніколі не знікне, бо на скуру ўсё роўна будуць уздзейнічаць біяхімічныя, функцыянальныя і імуналагічныя змяненні.

**Мазі і крэмы.** Для змяншэння запалення, свербу, змякчэння скуры прымяняюцца саліцылавая мазь, прэпараты нафталану, дзёгцю, гарманальныя мазі. Крэмы прызначаюцца пры высыпаннях на твары, ласьёны — пры пашкоджанні валасістай часткі галавы, аднак мазі — найбольш часта. Сродкі, якія змяшчаюць гармоны, нельга прымяняць працяглы час і на вялікіх участках. Перыядычнасць іх выкарыстання павінен устанавіць урач-дэрматолаг, бо бескантрольнае ўжыванне выклікае новыя праблемы — моцную сухасць скуры, кантактную форму дэрматыту, алергію, інфекцыйныя пашкоджанні.

**Задача хворага — навучыцца жыць з такім захворваннем. Пры ўзнікненні псарыязу заўсёды лепш паспрабаваць пралячыць яго.**

**Ультрафіялет.** Пры яго правільным выкарыстанні псарыяз спыняе распаўсюджанне, а сімптомы, якія з'явіліся раней, пакрысе заціхаюць.

**Фотахіміятэрапія** — адна з самых эфектыўных методык лячэння. Эфект заснаваны на ўздзеянні ўльтрафіялетавых промняў пэўнай даўжыні хвалі і ўжыванні лекаў-фотасенсібілізатараў.

**Вузкапалосная фотатэрапія** (ультрафіялетавыя промні пэўнай даўжыні хвалі).

**Лазернае ўздзеянне.**

**Інтэрферэнц-тэрапія (апарат «Псарыямед»)**, індуктатэрмія, квантавая гематэрапія.

**Бальнеалячэнне** — ванны з аксідатам торфу, сапрапелевыя, з марской соллю.

**Аплікацыі сакскай гразі, парафіналячэнне.**

**Медыкаментозныя прэпараты.** Седатыўныя, антыгістамінныя (пры моцным свербе), дыурэтыкі, нестэроідныя супрацьзапаленчыя сродкі, імунамадулятары, прэпараты, якія паляпшаюць перыферычны кровазварот, гепатапратэктары.

**Вітаміны.** A, $B_6$, $B_{12}$, C, D, E.

**Дыета.** Рэкамендуецца ўжываць больш свежых фруктаў і гародніны, менш бялковай ежы, але тут патрэбны індывідуальны падыход. Алергія і адчувальнасць да прадуктаў маюцца толькі ў некаторых хворых.

**Рэжым.** Сон — 9-10 гадзін у суткі. Пазбягаць пераахалоджвання і прастуды.

Пры цяжкіх формах прызначаюцца цытастатыкі (метатрэксат, сандымун). Пры эксудатыўным псарыязе прымяняецца гемасорбцыя, плазмаферэз ■

■ Псіхалогія для ўсіх

# Паглядзіце яго вачамі

**Сям'я — крыніца сілы і спакою. Праўда, не кожная, а толькі тая, дзе ёсць нармальная атмасфера, з гарманічнымі стасункамі. Рэдкая з'ява, а ўсё таму, што двое выраслі ў розных сем'ях, гарадах, краінах, нярэдка і ўзрост істотна адрозніваецца, і светаўспрыманне.**

— Часта нам раяць усё абмяркоўваць і дамаўляцца, — кажа **ўрач-псіхатэрапеўт Мінскага гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Уладзіслаў ІВАНОЎСКІ.** — Было б цудоўна, калі б так атрымлівалася. Але здараецца, што суразмоўцы чуюць не прамоўленае, а тое, што гатовыя пачуць. Як кажуць, калі б людзі маглі дамовіцца аб адзінстве тэрмінаў, то большасць знайшла б у праціўніках саюзнікаў...

**У нейкім сэнсе мы ўсе адзін для аднаго «замежнікі», носьбіты іншай «культуры».**

Адрозненні паміж псіхалогіяй мужчын і жанчын проста каласальныя. І спробы іх сцерці не маюць сэнсу. Перарабляць прыроду неразумна і бессэнсоўна. Цікавы вопыт набылі ў Ізраілі. Дзяцей апраналі ўнісекс, выхоўвалі ў хлопчыкаў жаночае імкненне да апекі, а ў дзяўчынак — любоў да спаборніцтва і многае з таго, што не ўласціва іх полу. Аднак дзяўчынкі па-ранейшаму праяўлялі заклапочанасць, спачуванне, эмоцыі, сакрэтнічалі і абмяркоўвалі паміж сабой усё, што адбываецца. Хлопчыкі ж імкнуліся да саперніцтва, выкарыстання фізічнай сілы. Дзяўчынак цікавілі стасункі і пачуцці, хлопчыкаў — свет рэальных прадметаў. Імкненне паламаць прыроду пацярпела крах.

Для большасці людзей абсалютна зразумела, што нормы паводзінаў у розных людзей могуць адрозніваца. Калі чалавек быў старэйшым дзіцем у сям'і, то навыкі кіраўніцтва і адказнасці за іншых найчасцей застаюцца з ім, як здольнасць дыхаць. І такі чалавек шчыра не разумее, чаму іншы не гатовы да супрацоўніцтва ў якасці «падпарадкаванага», тым больш складана дамовіцца, калі вопыт лідарства маюць абодва партнёры. Ім складана падладжвацца адно пад аднаго, пастаянна атрымліваецца «барацьба за ўладу». Малодшыя ў сем'ях прывыкаюць усё атрымліваць і не адказваць за іншых — такім складана быць вядучымі. А нехта наогул быў адзіным: для яго ідэальная кампанія — адзінота... У нейкім сэнсе мы ўсе адзін для аднаго «замежнікі», носьбіты іншай «культуры».

Дарослыя людзі, вядома, могуць навучыцца разумець адно аднаго. Але для гэтага трэба пастаянна ўлічваць індывідуальны вопыт таго, хто побач, увесь час глядзець яго вачыма і слухаць яго вушамі.



— Людзі, якія прыстасоўваюцца да сваёй другой паловы, вымушаныя лепш разумець і сябе, і таму ўвогуле становяцца лепшымі, — кажа Уладзіслаў Іваноўскі. — Галоўнае — адназначная перакананасць у тым, што нармальны менавіта гэты варыянт, а не пошук замены партнёра ■

■ Доктар адкажа

# ПАРУШЭННЕ РАЎНАВАГІ

***«Падкажыце, калі ласка, як праверыць сябе на каардынацыю рухаў, з чым можа быць звязана яе парушэнне?***

*Аксана Паўлаўна, г. Мінск».*

**Тлумачыць урач-неўролаг 11-й гарадской паліклінікі г. Мінска Юлія ВАРАНЬКО:**

— Само па сабе парушэнне раўнавагі не з'яўляецца захворваннем, але гэта сімптом, які можа ўзнікнуць пры самых розных захворваннях. Што ж можа прывесці да парушэння каардынацыі?

Фізічнае знясіленне арганізма. Уздзеянне алкаголю, наркатычных і іншых атрутных рэчываў. Інсульт, атэрасклероз сасудаў галаўнога мозга, энцэфалапатыя. Траўмы галавы. Пухліны галаўнога мозга. Рассеяны склероз. Паркінсанізм. Каталепсія (захворванне, пры якім чалавек застывае ў адной позе). Захворванні апорна-рухальнага апарату. Узроставыя змяненні ў арганізме.

Што трэба разумець пад парушэннем каардынацыі руху? Гэта з'яўленне трэмару — дрыжання кісцяў рук, галавы. Сімптом вельмі лёгка выявіць, калі папрасіць хворага што-небудзь напісаць на лісце паперы. Літары атрымліваюцца няроўныя, замест круга — зігзаг. Почырк у такога чалавека неразборлівы. Пры адных захворваннях трэмар нарастае ў стане спакою, а пры іншых — падчас руху.

Другі важны момант — хістанне падчас руху. Чалавек не можа прайсці па роўнай лініі, робіць крокі featuring рознай даўжыні.

Нарэшце, атаксія, пры якой пакутуюць лобныя аддзелы галаўнога мозга, іншыя важныя структуры нервовай сістэмы. Пры падазрэнні на атаксію пацыента просяць пастаяць з выцягнутымі наперад рукамі і заплюшчанымі вачамі. Ногі пры гэтым павінны быць «разам». Неабходна дакрануцца пальцам да носа (або лежачы на спіне дакрануцца пяткай да калена супрацьлеглай нагі).

Калі вы заўважылі ў сябе падобныя сімптомы, нейкія цяжкасці пры выкананні пералічаных дзеянняў, тэрмінова звярніцеся да ўрача — неўролага, кардыёлага, таксіколага ■

■ Тэхналогіі

# А РЭЦЭПТ — НА ПЛАСТЫКАВАЙ КАРТЦЫ

**У сталіцы да 15 лістапада рэалізуецца пілотны праект «Электронны рэцэпт». Плануецца, што ў наступным годзе на электронныя рэцэпты пяройдуць усе мінскія ўстановы аховы здароўя. Па меры гатоўнасці такая форма работы будзе ўкараняцца ўвогуле па рэспубліцы.**

Вопытная эксплуатацыя аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмы «Электронны рэцэпт» адбываецца пакуль на базе 19-й, 29-й, 34-й, 39-й паліклінік і аптэк «Белфармацыя». Пацыентам пералічаных паліклінік пасля прад'яўлення пашпарта выдаюць пластыкавыя карткі, на якія запісваюцца ўсе прызначэнні ўрача. Правізару аптэкі дастаткова адсканіраваць штрых-код карткі, каб убачыць на камп'ютары пералік прапісаных лекаў. У рамках пілотнага праекта захоўваецца пакуль і афармленне папяровых аналагаў. Далей картка дазволіць запісацца на прыём да ўрача праз інфакіёск, скарыстацца паслугай інтэрнэт-выкліку ўрача на дом. Распрацавалі электронны рэцэпт Аб'яднаны інстытут праблем інфарматыкі НАН і РНПЦ медыцынскіх тэхналогій, інфарматызацыі, кіравання і эканомікі аховы здароўя ■

■ Рэпрадуктыўнае здароўе

# А ЎСЁ МАГЛО Б БЫЦЬ ІНАКШ

**Прычыны банальныя. Галоўным чынам, ігнараванне кантрацэпцыі або нерэгулярнае, няправільнае яе выкарыстанне. У рэдкіх выпадках — абраны метад даў збой. Палова незапланаваных цяжарнасцей заканчваецца абортам. Ці можна іх выкараніць? Забараніць? Не дапусціць?**

Гадоў трыццаць таму ў нашай краіне штогод выконвалася каля 300 тысяч перарыванняў цяжарнасці. Але сёння нашы спецыялісты не схільны азмрочваць сітуацыю, паколькі цяпер выконваецца каля 30 тысяч падобных маніпуляцый у год (у гэтую статыстыку, дарэчы, уваходзяць і выкідышы), што ў дзесяць разоў менш, чым было. Крымінальныя аборты лічацца казуістыкай. Тым не менш, тэму абортаў нельга скідваць з рахунку і заспакойвацца, таму што гэта надзвычайна сур'ёзнае ўмяшанне ў справы арганізма.

Аборты немагчыма забараніць. Гэта абавязкова прыводзіць да з'яўлення крымінальных маніпуляцый. У нашай краіне і трыццаць гадоў таму аборты былі цалкам легальнымі. Але паразмаўляйце з гінеколагамі, якія працавалі ў той час, і даведаецеся, што нават пры поўнай даступнасці такой спецыфічнай лячэбнай дапамогі жанчыны ўхітраліся нашкодзіць сабе па максімуме. У ход ішлі і «ядавітыя» напоі з траў, і спіцы, і парылкі, і газа... Дзякуй Богу, сёння такога няма, аднак гэта не азначае, што аборты можна ў прынцыпе звесці да нуля.

— Я не люблю выкарыстання слоў «бяспечны»-«небяспечны» ў дачыненні да абортаў, — кажа **дацэнт кафедры акушэрства, гінекалогіі і рэпрадуктыўнага здароўя Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, кандыдат медыцынскіх навук Марына ЦЕСАКОВА.** — Любое ўмяшанне такога кшталту, уключаючы вакуум-аспірацыю або «пяшчотныя таблеткі» — медыкаментозны аборт — з'яўляецца надзвычай небяспечнай працэдурай.

— Кожная аперацыя — гэта аперацыя, якая нясе з сабой рызыку развіцця ўскладненняў, — дадае **дацэнт кафедры акушэрства і гінекалогіі Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, кандыдат медыцынскіх навук Алена КІРЫЛАВА.** — Яны могуць быць звязаны з траўматызацыяй, крывастратай, наркозам, інфіцыраваннем, а ў перспектыве — з бясплоднасцю, невынашваннем, рызыкай узнікнення пазаматачнай цяжарнасці.

Не дапусціць развіцця падзей па сумным сцэнарыі дапамагае правільнае планаванне цяжарнасці і выкарыстанне сучасных метадаў кантрацэпцыі. Паводле даных абследавання, праведзенага ў 2012 годзе, 63 працэнты 15-49-гадовых жанчын (замужніх або тых, у каго «грамадзянскі шлюб») выкарыстоўваюць той ці іншы метад кантрацэпцыі.

Вядома, што самым эфектыўным метадам папярэджвання цяжарнасці з'яўляецца вазэктамія ў мужчын і стэрылізацыя ў жанчын. Трэба адразу сказаць, што нашы мужчыны на такую працэдуру амаль ніколі не пагаджаюцца, а што да жанчын, то тут вядучым будзе не толькі само жаданне, а наяўнасць двух дзяцей і дасягненне 30-гадовага ўзросту. Бывае, на такую працэдуру (яна платная) ідуць жанчыны, якія нарадзілі дваіх дзяцей метадам кесарава сячэння.

Наогул, існуе цэлы шэраг метадаў засцярог ад цяжарнасці — натуральныя (тэмпературны, каляндарны, перарванага палавога акта і інш.), бар'ерныя (прэзерватыў, дыяфрагма, матачны каўпачок) і хімічныя (аэразолі, свечкі, унутрыматачныя спіралі), а таксама ін'екцыі, пластыры і, нарэшце, аральныя кантрацэптывы, у склад якіх уваходзяць гармоны. У Беларусі сучасную гарманальную кантрацэпцыю выкарыстоўваюць ад 3 да 20 працэнтаў жанчын (у залежнасці ад рэгіёна і з улікам таго, што многія прымаюць гэтыя гармоны кароткімі курсамі, скажам, падчас планавання цяжарнасці). Між тым, у Германіі размова ідзе пра 48 працэнтаў такіх жанчын.

Наўрад ці ўсур'ёз можна гаварыць аб тым, што беларускам перашкаджае водпуск гэтых прэпаратаў па рэцэпце. Звычайна рэцэпт выпісваецца мінімум на тры месяцы, ды і прыйсці па яго можна нават у суботу.

# КОЖНАЯ ТРЭЦЯЯ ЦЯЖАРНАСЦЬ — НЕЗАПЛАНАВАНАЯ. ЧАМУ?

Верагодна, праблема хаваецца ў нізкай інфармаванасці, звязанай з цэлым шэрагам «барадатых» міфаў, якія паходзяць з тых гадоў, калі гармоны толькі з'явіліся і мелі сур'ёзныя пабочныя эфекты. Вядома, не існуе медыцынскіх прэпаратаў без пабочных эфектаў, аднак навука не стаіць на месцы, і кожнае новае пакаленне супрацьзачаткавых сродкаў мае ўсё менш проціпаказанняў і негатыўных наступстваў.

— Існуюць розныя тыпы камбінаваных аральных кантрацэптываў, у склад якіх уваходзяць розныя сінтэзаваныя гармоны ў розных дозах, — тлумачыць **дацэнт кафедры акушэрства, гінекалогіі і рэпрадуктыўнага здароўя БелМАПА Дзмітрый БУР'ЯК.** — Акрамя надзейнай кантрацэптыўнай абароны, яны валодаюць шэрагам дадатковых эфектаў: змяншаюць боль падчас менструацыі, скарачаюць аб'ём крывастраты, паляпшаюць стан скуры і валасоў, аказваюць станоўчае дзеянне пры наяўнасці перадменструальнага сіндрому. Сёння гэтыя прэпараты паказваюць сваю эфектыўнасць і ў прафілактыцы раку яечнікаў, эндаметрыю, тоўстай кішкі, увогуле станоўча ўздзейнічаюць на рэпрадуктыўнае здароўе.



Сучасныя камбінаваныя аральныя кантрацэптывы змяшчаюць, як правіла, два гармоны — эстраген і прагесцін. Гэта сінтэзаваныя варыянты ключавых гармонаў, якія кантралююць менструальны цыкл. Гармоны ў такой таблетцы аказваюць трайное дзеянне: перашкаджаюць авуляцыі (выхаду яйцаклеткі з яечнікаў), не дазваляюць сперматазоідам трапіць у матку (за кошт надта густой слізі), змяняюць структуру эндаметрыю (слой, які высцілае матку), што не дазваляе замацавацца аплодненай яйцаклетцы.

Кантрацэптывы апошняга пакалення ствараюцца такім чынам, каб максімальна адпавядаць прыроднаму стану арганізма. У Беларусі ўжо з'явіліся прэпараты з натуральным эстрагенам. Ёсць такія, што змяшчаюць метафалін, які да моманту планавання цяжарнасці назапашвае ў арганізме дастатковую колькасць фалатаў, неабходных для нармальнага развіцця плода.

Каб данесці да жанчын і мужчын рэпрадуктыўнага ўзросту важнасць кантрацэпцыі і клопату аб рэпрадуктыўным здароўі, Беларуская асацыяцыя ўрачоў пры падтрымцы кампаніі Bayer у хуткім часе плануе пачаць адукацыйную праграму для студэнтаў ВНУ, іх бацькоў і выкладчыкаў «Тваё жыццё. Твая будучыня». Галоўным чынам, гэта будзе магчымасць задаць спецыялістам любыя пытанні аб палавым жыцці і кантрацэпцыі, а таксама расповед пра тое, як важна планаваць нараджэнне дзяцей, а не дзейнічаць па сітуацыі.

**«У Беларусі ўжо з'явіліся прэпараты з натуральным эстрагенам. Ёсць такія, што змяшчаюць метафалін, які да моманту планавання цяжарнасці назапашвае ў арганізме дастатковую колькасць фалатаў, неабходных для нармальнага развіцця плода».**

— Ва ўсім свеце пары прымяняюць не толькі аральную кантрацэпцыю, але і выкарыстоўваюць прэзерватыў — бар'ер ад інфекцый, — кажа Марына Цесакова. — Мы павінны расказаць нашай моладзі, што жанчына пры адсутнасці гэтых дзвюх умоў вельмі рызыкуе не толькі з пункту гледжання непажаданай цяжарнасці, але і ў сэнсе заражэння палавымі інфекцыямі.

— Нашы мужчыны маюць вельмі слабае ўяўленне аб гэтай тэме, — зазначае **старшыня Беларускай асацыяцыі ўрачоў Дзмітрый ШАЎЦОЎ.** — Можна сказаць, яны знаходзяцца ў каменным веку. Падчас штогадовай дыспансерызацыі не набіраецца і 20 працэнтаў беларускіх мужчын, якія наведваюць уролага ■

**Матэрыялы паласы падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*

■ Асобы

# МАДЭЛЬ МІКРАСВЕТУ ВІКТАРА АЛЬШЭЎСКАГА

**Гермес праносіцца над Мінскам з навінамі, у ГУМ ідуць статуі з Луўра, а стадыён «Дынама» становіцца Калізеем... Усё немагчымае становіцца магчымым у працах Віктара Альшэўскага, бо ён лічыць, што «мастацтва — гэта не тое, што мы бачым, а тое, што мы думаем». Ён прымушае думаць падчас персанальнай выставы «Мой Мінск. Сімвалы прасторы і часу». У сталічнай галерэі М. Савіцкага прадстаўлена каля 30 прац. Але хіба магчыма паказаць усё з таго, што сабрана ў яго важкіх каталогах? У майстэрні творцы, акрамя неверагодна прыгожых карцін і безлічы кніжных паліц, ёсць некалькі вялізных дрэў. Ён на адлегласці тысяч кіламетраў адчувае, як расліны пакутуюць. Акрамя раслін, ён добра адчувае і людзей — «без псіхалогіі мастацтва мёртвае». І яшчэ шмат што пра тое, як праз мастацтва адчуць любоў да краіны, распавёў нам Віктар Альшэўскі.**


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

***— Вас называюць беларускім Далі. А ці важны для вас імідж?***

— Так, мяне называюць беларускім Далі, але не таму, што я да гэтага імкнуўся. Для мяне імідж — гэта, хутчэй, рыса, якая адрознівае ад іншых, нейкая асаблівасць. Вочы, усмешка, фізічны стан — усё гэта вызначае і энергетыку. Мне здаецца, што псіхалагічны стан чалавека фарміруе яго знешняе аблічча. Таму казаць пра тое, што можна стварыць імідж, я б не стаў: імідж без унутраных якасцей — пусты, ён павінен прыходзіць знутры. Калі імідж штучны — чалавека заўважаюць па прычосцы, напрыклад. Я не прыхільнік гэтага. Для таго, каб цябе пазнавалі, не абавязкова ставіць валасы тарчма. Імідж становіцца важным толькі тады, калі гэта гармонія знешнасці і ўнутранага свету, калі гэта арганічна і ненаўмысна. Імідж без творчасці — нішто, гэта тэатральны перфоманс, падман. Для мастака, калі ён не ўмее нічога, імідж не будзе выратавальным кругам. Гэта тое ж, калі замест хлеба атрымаць штосьці закамуфліраванае пад хлеб.

**«Малюй абсурд, стаў сабе мэту, размазвай фарбу, ствараймвобразы. Пастаянна трэба вучыцца, шукаць ва ўсім крыніцы і сімвалы».**

***— Скажыце, а ці лёгка ў Беларусі зрабіць персанальную выставу?***

— З гэтым няма ніякіх праблем, пытанне толькі ў тым — дзе і, галоўнае, каб у гэтым быў сэнс, каб гэта было мэтазгодна. Людзі, якія гоняцца за вялікімі пляцоўкамі, не разумеюць, што паказаць працы можна нават дома — і гэта будзе персанальная выстава. Не заўсёды яна павінна быць маштабнай і музейнафарматнай, бо эканамічнае пытанне арганізацыі любога мерапрыемства застаецца адкрытым. На маю думку, у Беларусі вельмі проста правесці выставу — усё залежыць ад ініцыятывы. Я выстаўляўся і ў маленькіх гарадах Беларусі, і за мяжой, цяпер — у Мінску, а хутка адкрыецца выстава ў Парыжы. Але выставы — гэта не самамэта, бо большая іх частка не прыносіць ніякага прыбытку, такія мерапрыемствы патрабуюць каласальных выдаткаў. Часам, укладаючы шмат, не атрымліваеш нічога. У нашай краіне няма мастацкага рынку, каб можна было прадаваць карціны ці працаваць з менеджарамі, як у Еўропе, але мастацтва там — гэта проста тавар.

***— Што можа дапамагчы ў арганізацыі выставы: толькі творчасць ці ўзнагароды маюць значэнне?***


Старонкі мінскай гісторыі.

— Я б падзяляў гэтыя паняцці: тое, што дапамагае, і ўзнагароды. У Льва Талстога, напрыклад, узнагарод не было, але ў яго быў талент. Многія мастакі імкнуцца да таго, каб маніпуляваць узнагародамі. Паняцце звання — гэта проста падтрымка, заахвочванне, калі чалавек працуе. Узнагарода не павінна мець значэнне, яна нават не мая — гэта ўзнагарода маіх бацькоў, майго настаўніка Міхаіла Савіцкага, маёй сям'і. Гэта прызнанне за калектыўную працу.

***— Ваша творчасць — гэта тое, што ўнутры вас, ці тое, што вы бачыце вакол сябе?***

— Творчасць — гэта ўсё. Гэта і гістарычная памяць, і падсвядомае, і несвядомае, і, натуральна, свядомае. Мастак можа проста маляваць прыроду, калі глядзіць на яе, а можа фарміраваць светаўспрыманне, калі прыдумвае ідэю сваёй карціны. Мастацтва непадуладнае кожнаму, бо чалавек бачыць толькі паверхню, а дэталі трэба аналізаваць. Але для мяне больш важнае, напэўна, тое, што бачу я. Я магу гэта ўспрымаць і адлюстроўваць праз уласнае бачанне. Мастак і прастора — гэта вечнае пытанне. Калі я малюю сюжэт, то гледачы ўбачаць плоскасць, яны павінны праз сябе прапусціць пейзаж і атрымаць уласны малюнак. У гэтым і ўзаемасувязь: чалавек не можа нараджаць штосьці, не напоўніўшы свой уласны сасуд.

***— У вас ёсць серыя карцін, прысвечаных гістарычным асобам. Чым для вас важная гісторыя?***

— Я спрабую зразумець прастору на 2-3 тысячы гадоў таму. Вось мая калекцыя «Музеі свету» створана для таго, каб людзі, якія прыйшлі ў Луўр, у Эрмітаж, трапілі не проста ў музей, а ў асяроддзе, дзе сутыкнуліся цывілізацыі, каб яны адчулі энергію розных пакаленняў, рухаліся ў лабірынце розных эпох. Зрабіць адкрыццё, не ведаючы, што было раней, проста немагчыма. Мастакі не робяць чагосьці звышнатуральнага. Мы ствараем новы прадукт, новае разуменне, магчыма, светаўспрыманне, у кантэксце гістарычнага мінулага.

***— Што для вас творчы эксперымент у мастацтве?***

— Калі ўзяць, напрыклад, матэматычную формулу — не заўсёды можна яе зразумець. Такая ж формула і мастацтва. Не заўсёды можна зразумець музыку, карціны. Глядач бачыць толькі паверхню, толькі частку айсберга, а каб зразумець карціну, каб расшыфраваць сімвалы — трэба пастарацца. Творчы эксперымент — гэта пастаянная праца над сабой, гэта перапрацоўка, каб дасягнуць дасканаласці, гэта барацьба з сабой. Творчы эксперымент — гэта праца, якая прывядзе да віртуознасці, гэта пастаянны пошук новага мыслення, гэта не новы прадукт, бо прадукт — гэта вынік.

***— Вы калісьці былі маладым мастаком і працавалі са студэнтамі. Як рэалізавацца маладым у творчасці?***

— У мяне ёсць рэцэпт: ведаць, чаго ты хочаш, быць прафесійна падрыхтаваным, не капіраваць настаўніка, а ўзяць найлепшае, быць паслядоўнікам, вынаходзячы новае. Трэба надаваць увагу дысцыпліне і працы. Кожны дзень у адзін і той жа час рабіць штосьці для свайго прафесійнага развіцця. Ніколі не трэба скардзіцца, што праца не атрымліваецца — гэта адгаворкі, праз некаторы час усё атрымаецца. Малюй абсурд, стаў сабе мэту, размазвай фарбу, ствараймвобразы. Пастаянна трэба вучыцца, шукаць ва ўсім крыніцы і сімвалы. У творчых людзей ёсць шмат шанцаў для рэалізацыі — можна ўдзельнічаць у конкурсах, ёсць гранты. Самаадукацыя + праца + здольнасці кіраваць сабой — гэта і ёсць аснова.

***— Як зрабіць так, каб дзяржава заўважыла творцу?***

— У дзяржавы ёсць такая асаблівасць, што яна ў кожным пакаленні знаходзіць людзей, якія працуюць на сваю краіну, якія і ёсць краіна. Мастак узнагароджваецца ў першую чаргу за грамадзянскую пазіцыю і актыўную творчую дзейнасць. Менавіта такіх людзей, якія адчуваюць краіну, заўважае дзяржава. Але мала хацець месца пад сонцам, трэба паказваць вынік. Абвінавачваць кагосьці, што цябе не прызнаюць, — гэта тое ж, што абвінавачваць сябе ў непрызнанні іншых.

**ДА ВЕДАМА**

*Віктар Альшэўскі, ураджэнец Магілёўшчыны, пасля заканчэння школы вучыўся ў Рэспубліканскай школе-інтэрнаце па музыцы і выяўленчым мастацтве. Пасля працаваў мастаком у Навукова-даследчым інстытуце эканомікі, дзе адбылася яго першая персанальная выстава. Потым паступіў у Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут, дзе пад уплывам Гаўрылы Вашчанкі, Анатоля Бараноўскага і Васіля Шаранговіча прайшло студэнцтва мастака. 4 гады працаваў і вучыўся ў творчай майстэрні Міхаіла Савіцкага, якому і цяпер дзякуе за свой поспех. Віктар Альшэўскі — сябра Саюза мастакоў, прафесар, выкладаў у Дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Разам з аднадумцамі стварыў грамадскае аб'яднанне «Беларуская акадэмія выяўленчага мастацтва», кіраваў «Цэнтрам сучасных мастацтваў».*

*Віктар Альшэўскі з тых мастакоў, якія не толькі прадстаўляюць Беларусь за межамі, але актыўна выстаўляюцца ў самых розных гарадах роднай краіны: Барысаве, Светлагорску, Магілёве, Бабруйску, Шклове, Асіповічах, Бялынічах і іншых. У 2009 годзе Віктар Альшэўскі стаў лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь за серыю твораў для Гомельскага палацава-паркавага ансамбля, у 2013 годзе мастаку быў уручаны медаль Францыска Скарыны.*

*Мастацкія працы можна ўбачыць не толькі ў Беларусі (Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь, Музей сучаснага выяўленчага мастацтва) — яго творы захоўваюцца ў Траццякоўскай галерэі ў Маскве, у маскоўскім «Цэнтральным доме мастака», у галерэях Германіі, Нарвегіі, Польшчы, Італіі, Францыі, Іспаніі, Аўстрыі, ЗША і іншых краін.*


Легенда Мірскага замка.

Дзяржава — гэта кожны чалавек. Мы не павінны ад яе штосьці патрабаваць. Дзяржава стварае для нас умовы, якія дазваляюць трымацца на паверхні. Калі такая сітуацыя не задавальняе, можна паехаць у якую заўгодна краіну, паказаць там сваё мастацтва. Але гэта не значыць, што ў іншай краіне мастак атрымае прызнанне. Мне ніколі не было ў Беларусі дрэнна. Я наадварот заўсёды хацеў сюды вярнуцца, ведаў, што мне тут будзе добра.

***— Ці важна для вас быць зразумелым гледачу?***

— Гледачоў вельмі шмат. Калі мастак будзе думаць выключна пра публіку, а не пра ўласнае разуменне свету, то ён проста згубіць сябе. Каб зразумець тое, што хацеў сказаць мастак, трэба спачатку зразумець сябе. Я, напрыклад, разумею ўсіх мастакоў, бо гляджу на іх вачыма іх магчымасцей, іх уласнага разумення. Я не гляджу праз сябе, я не магу даваць парады. Гэта ўласнае «Я» кожнага, і падстройвацца пад кожнага проста немагчыма. Трэба казаць тое, што хочацца, рэалізоўваць ідэі. Калі чалавек захоча зразумець твор, ён зразумее. Калі ён не разумее, значыць, яму гэта, верагодна, проста не патрэбна.

**Маргарыта ДЗЯХЦЯР**

■ Увага, конкурс

## НАВЕДАЎ СЛАВУТАСЦЬ — ПРЫБЯРЫ ВАКОЛ ЯЕ!

### У краіне стартаваў конкурс па прыбіранні смецця на гісторыка-культурных аб'ектах

**З верасня па снежань 2015 года кожны, хто падарожнічае па Беларусі, можа паўдзельнічаць у конкурсе «Чыста славутасці», арганізаваным таварыствам «Зялёная сетка», і выйграць каштоўную фотатэхніку.**

Каб атрымаць шанц на перамогу, неабходна падчас наведвання беларускіх славутасцяў агледзець, наколькі чыстая тэрыторыя вакол іх, і пры выяўленні бытавога смецця (шкляных і пластыкавых бутэлек, металічных бляшанак, поліэтыленавых пакетаў, фольгі ад марожанага, іншых упаковак) сабраць яго ў прывезеныя з сабой пакеты. Выкінуць смецце трэба ў найбліжэйшы знойдзены смеццязборнік (пажадана рассартаваць яго і выкінуць у кантэйнеры для паасобнага збору адходаў).

Працэс прыборкі, утылізацыі і стану аб'екта «да» і «пасля» прыбірання, а таксама сабранага і ўтылізаванага смецця ўдзельнікі конкурсу павінны зафіксаваць на фота. Неабходна таксама зарэгістравацца на форуме сайта «Глобус Беларусі» і выкласці вынікі працы ў тэме «Конкурс «Чыста славутасці». Гэта павінна быць асобнае паведамленне з указаннем населенага пункта і назвы славутасці, фотаздымкамі (не больш за 6) і, пры неабходнасці, тлумачальным тэкстам.

Вынікі конкурсу падвядуць 10 снежня 2015 года. Уладальнік Гран-пры конкурсу «Чыста славутасці» атрымае сертыфікат на набыццё фотатэхнікі на суму да 600 еўра, сярэбраныя і бронзавыя пераможцы — знешні партатыўны акумулятар і штатыў для фотаапарата адпаведна.

Паведамленні аб жаданні прыняць удзел у конкурсе, а таксама справаздачы можна размяшчаць на форуме «Глобус Беларусі» да 5 снежня 2015 года ўключна.

**Вераніка КОЛАСАВА**

■ Добрая навіна

## Унікальны ўльтрагукавы апарат

**У Полацкай цэнтральнай гарадской бальніцы з'явіўся ўльтрагукавы апарат, які пакуль што не мае аналагаў у вобласці.**

Аналагічных апаратаў у краіне было толькі два. Асаблівасць у тым, што з яго дапамогай можна выявіць паталогію на самых ранніх стадыях захворванняў. Апарат коштам каля 850 мільёнаў рублёў таксама знойдзе прымяненне ў акушэрстве і гінекалогіі. У прыватнасці, выяўляе праблемы на ранніх стадыях цяжарнасці. Гэта, безумоўна, зможа станоўча паўплываць на дэмаграфічную сітуацыю, знізіць узровень смяротнасці, у тым ліку і перынатальнай, — паведаміла «Звяздзе» **Валянціна УЛАСЕНКА, прэс-сакратар Полацкага райвыканкама.**

У дзень прайсці абследаванне стану здароўя могуць да 50 чалавек.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*

■ Паспей паглядзець!

# У АБ'ЕКТЫВЕ ВАЕНКАРА

### Рарытэтныя фотаздымкі перыяду Вялікай Айчыннай вайны з найбуйнейшай у свеце калекцыі класічнай савецкай фатаграфіі экспануюцца ў Мінску

**Дзесьці на гарызонце ідуць у атаку савецкія салдаты. Пакідаюць родныя хаты і вяртаюцца — ужо на папялішчы — сяляне. Хаваюцца ад бамбёжкі дзеці. Знемагаюць ад болю параненыя. Здаюцца ў палон нямецкія салдаты, быццам на парадзе — каробкамі — ідуць па шырокім праспекце той краіны, гаспадарамі якой хацелі стаць. На мяне глядзяць толькі што вызваленыя вязні Асвенцыма, на спакутаваных тварах якіх цяжка распазнаць радасць. І ўжо не могуць глядзець тыя, чый попел, а таксама недагарэлыя часці цела віднеюцца з крэмацыйных печаў...**


Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.
Саўладальнік калекцыі «Borodulin's collection» Аляксандр БАРАДУЛІН.

Гэта не сон. Не падручнік па гісторыі. І нават не кінастужка, дзе сабраны вядомыя і не зусім эпізоды Другой сусветнай вайны. Гэта выстава-праект «Паспець паказаць...», што адкрылася ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Работы, якія з'яўляюцца класікай ваеннай фатаграфіі, у Мінск прывёз калекцыянер і фатограф Аляксандр Барадулін. Калекцыя сям'і Барадуліных — адна з найбуйнейшых і дарагіх у свеце калекцый савецкай фатаграфіі. Яе складаюць сапраўдныя рарытэты фотахронікі СССР з 1917 па 1991 год. Аўтары работ — прызнаныя класікі фотамастацтва: Яўген Халдзей, Макс Альперт, Дзмітрый Бальтэрманц, Анатоль Марозаў, Аляксандр Дзітлаў...

Няўжо вам не вядомы фотаздымкі, на якіх Ягораў і Кантарыя ўзнімаюць Сцяг Перамогі над Рэйхстагам, камбат з пісталетам у руцэ падымае ў атаку салдат, Чэрчыль, Рузвельт і Сталін сядзяць падчас Ялцінскай канферэнцыі, маршал Жукаў падпісвае акт аб капітуляцыі? Парад Перамогі ў Маскве 24 чэрвеня 1945 года, палонныя немцы, вязні Азарыцкага канцлагера — гэтыя і многія іншыя фатаграфіі знаёмы яшчэ са школьных падручнікаў па гісторыі, з хрэстаматыйнай літаратуры.

— Асноўны пласт ваеннай фатаграфіі трапіў да нас пасля Другой сусветнай, — расказвае саўладальнік калекцыі «Borodulin's collection» Аляксандр Барадулін. — Мой бацька, Леў Барадулін, прайшоў вайну з першага па апошні дзень: ад Масквы да Берліна. Фатаграфаваць пачаў пасля. У асноўным здымаў салдат, якія вярталіся з фронту, — так зарабляў сабе на хлеб. Калі ўсур'ёз захапіўся фатаграфіяй, камандаванне папрасіла бацьку сабраць фоталетапіс палка, у якім той служыў. І ён пачаў хадзіць па масцітых фатографах, чые работы ўжо былі вядомы. Падчас гэтых сустрэч успаміналі вайну, пасля чаго фатографы аддавалі бацьку некаторыя здымкі. Ён, у сваю чаргу, плаціў за абед ці вячэру. Так пачала ствараецца калекцыя.

Потым калекцыянаваць фотаздымкі ўваходзіла ў абавязкі Льва Барадуліна: ён працаваў штатным фотакарэспандэнтам часопіса «Огонёк». Рэдакцыйную фоталабараторыю дзяліў з вядомым фатографам Дзмітрыем Бальтэрманцам, чый фотаздымак «Гора», як і «Сцяг Перамогі над Рэйхстагам» Яўгена Халдзея, абышоў увесь свет і стаў сімвалам Другой сусветнай вайны. Натуральна, што «аганькоўцы» дапамагалі яму з калекцыяй. Больш актыўна Леў Барадулін пачаў яе папаўняць, калі пайшоў на пенсію. Потым да справы бацькі падключыўся і сын. Аляксандру Барадуліну, як фатографу, хацелася захаваць тое, што ў перыяд распаду СССР пачало знішчацца.

— Як для бацькі, так і для мяне тэма Другой сусветнай вайны заўсёды была найважнейшай у калекцыі, — прызнаецца фатограф і і калекцыянер. — Я практычна вырас без сваякоў: іх адабрала вайна. Гэта 12 братоў і сясцёр маіх бабулі і дзядулі, якія загінулі ў Бабіным Яры, гэта мой дзядзька па матчынай лініі, які пайшоў у апалчэнне і паў пад Масквой, гэта сваякі з Польшчы, лёс якіх не вядомы і сёння. З вайны вярнуліся толькі мой бацька, які, атрымаўшы два раненні, цудам застаўся жывым, і яго брат. Усё гэта зрабіла гэтую частку калекцыі вельмі асабістай.

А надзвычай аўтарытэтнай робяць яе фотаздымкі Яўгена Халдзея. Нягледзячы на тое, што Леў Барадулін і вядомы фатограф былі добрымі таварышамі, работы, звязаныя з імем славутага фотамастака, трапілі ў калекцыю дзякуючы сыну.

— Яўген Халдзей быў бясстрашным і разам з тым дзіка ўзлаваным на фашыстаў чалавекам, — успамінае Аляксандр, які не раз сустракаўся з легендай савецкай фатаграфіі. — Гледзячы на свае фотаздымкі, ён ненавідзеў усё гэта. Лёс Яўгена Халдзея склаўся не вельмі паспяхова. У пэўны час яго звольнілі з усіх ганаровых выданняў. Фатограф быў нікому не патрэбен і, здавалася, забыты ўсімі. Жыў вельмі бедна. За тую суму грошай, якую я заплаціў яму за фотаздымкі, па тым часе можна было набыць у Маскве кватэру. Гэта выратавала яго становішча. Аднойчы, калі я даследаваў архіў Яўгена Ананьевіча, натрапіў на папку пад назвай «Зверствы фашызму». Там убачыў фотаздымкі ахвяр гітлераўцаў, не звязаныя з працай Халдзея. Аказалася, што ён збіраў іх усё сваё жыццё, каб людзі бачылі, да чаго можа прывесці вайна.


Міхаіл Ананьін. Пракляцце вайны. Абаронцы Брэсцкай крэпасці. 1972.



Яўген Халдзей. Апошняя вясна вайны. Рэгуліроўшчыца Марыя Шальнова. Май, 1945.


Аляксандр Дзітлаў. Вяртанне з партызанскага лесу. Беларусь. 1944.

У экспазіцыі — каля 170 арыгінальных фатаграфій. Частка здымкаў, дарэчы, зроблена на тэрыторыі Беларусі. Некаторыя з іх дагэтуль ніколі не дэманстраваліся. «Ваша краіна вельмі пацярпела ў гады Вялікай Айчыннай вайны, — гаворыць Аляксандр Барадулін. — Калі глядзіш на фотаздымкі Мінска ваеннага перыяду і ўвогуле на ўсё тое, што тут адбывалася, валасы дуба становяцца. І мне б вельмі хацелася, каб будучыя пакаленні ўсё гэта ведалі і помнілі».

Фотаздымкі з калекцыі Барадуліных у Мінску прадстаўлены ўпершыню. Ідэя паказаць іх беларускаму гледачу з'явілася ў Маі Кацнельсан, якая стала куратарам выставы-праекта. «Убачыўшы гэтыя фотаздымкі толькі раз, забыць іх ужо немагчыма, — перакананая яна. — Кожнае фота — гэта шэдэўр, створаны ў прамым сэнсе на мяжы жыцця і смерці. Іх патрэбна паказаць менавіта зараз, каб задумацца і не паўтарыць больш ніколі».

Дарэчы, заснавальнік унікальнай калекцыі Леў Барадулін так і назваў яе — «Паспець паказаць». Ён вельмі баяўся, што не дажыве і не паспее расказаць аб фатаграфіях. На шчасце, калекцыянер яшчэ жывы. Толькі зараз пра іх расказвае ўжо яго сын.

Пабачыць унікальныя фатаграфіі, а таксама фотаапараты ваенных карэспандэнтаў з фондаў Белдзяржмузея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны можна, набыўшы ўваходны білет у музей. Выстава-праект «Паспець паказаць...» дзейнічае да 15 лістапада. Таму засталося не так шмат часу, каб паспець паглядзець.

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by*

■ Экслібрыс «Звязды»

# Прафесія: вадзянік

***Наталля Бучынская. Атракцыёны для вадзянікоў. — Мінск: Мастацкая літаратура, 2015. — 80 с.***

Калі я была маленькая, то мела досыць цвёрдае перакананне: Вадзянік, які жыве ў возеры ў бабулінай вёсцы, мае толькі два клопаты — пускаць бурбалкі (пазней яны ператвараюцца ў пену ля берага) і палохаць дзяцей, якія знаходзяцца ля вады (ці ў вадзе) без нагляду дарослых. Магчыма, карані гэтага меркавання хаваюцца ў наказах бабулі, каб мы з сёстрамі і братам надта шмат не хадзілі ля берага і не купаліся доўга, асабліва ў поўдзень. Таму, калі і вы маеце нейкія ўласныя стэрэатыпы адносна заняткаў вадзянікоў, іх функцый у возеры ці рацэ, а магчыма, іх знешняга выгляду, то будзьце гатовыя: пасля знаёмства з новай кнігай дзіцячай пісьменніцы Наталлі Бучынскай ад ранейшых перакананняў не застанецца і каменя на камені.




Не верыце? Мяркуйце самі. Галоўны герой казкі «Пра сяброўства Вадзяніка і Лесуна», што ўваходзіць у гэтае выданне, — Вадзянік. Ён мусіць сачыць за парадкам на дне і па берагах возера Доўгае, што ў Глыбоцкім раёне (як вядома, гэта самае глыбокае возера ў нашай краіне). У Вадзяніка шмат клопатаў: скасіць аер, каб берагі не зарасталі, уладкаваць на дне прыгожыя мясцінкі з рознакаляровай гліны, сачыць, каб жыццё іншых насельнікаў возера — рыб і рачкоў — ішло сваім парадкам. А яшчэ, паколькі ён добра сябруе з Лесуном, трэба час ад часу сустракацца са старым прыяцелем, частавацца прысмакамі з лесу і бясконца пераконваць яго ў тым, што і ў возеры жыць цікава і весела (Лясун не ўмее дыхаць пад вадой, таму яму застаецца толькі верыць на слова таварышу). Пагадзіцеся, не так і мала клопатаў у Вадзяніка. Навошта яму дзяцей палохаць ды бурбалкі пускаць?

А яшчэ ў жыцці старога Вадзяніка часам здараюцца нечаканыя падзеі: то Азёрная камісія завітае з праверкай, то папросіцца на працу малады Вадзянічок, выпускнік адмысловай Акадэміі. І тады нашаму герою трэба выступаць з прамовамі перад шаноўнай грамадой, выпраўляць хібы ў працы маладога і нявопытнага калегі ці нават... складаць бізнес-план парка атракцыёнаў. Зрэшты, не буду забягаць наперад і распавядаць пра ўсе прыгоды гэтага памяркоўнага героя. Чытайце казку — і пра ўсё даведаецеся самі.

Але не толькі твор пра Вадзяніка ўвайшоў у выданне, пра якое ідзе гаворка. Пад вокладкай кнігі змясціліся яшчэ дзве гісторыі, аб'яднаныя агульнай тэмай жыцця ў вадзе. Гэта казка «Як бабры прытулак шукалі» пра сям'ю баброў, што імкнецца наладзіць уласнае жыццё побач з чалавекам, і прыгожая, кранальная легенда «Наяда марская, або Услед за песняй». Цікавыя тэксты дапаўняюць выдатныя малюнкі мастака Андрэя Пазняка. А яшчэ — што надзвычай карысна для маленькага і дапытлівага чытача — тут можна знайсці звесткі-даведкі пра возера Доўгае, пра баброў і Чырвоную кнігу Беларусі. Так Наталля Бучынская нібыта апярэджвае пытанні дзетак бацькам і прапануе свае поўныя адказы на іх. Думаецца, кнігу «Атракцыёны для вадзянікоў» можна выкарыстоўваць і падчас заняткаў у старшых групах дзіцячага садка ці пачатковых класах школы. Цікавых звестак тут цалкам дастаткова.

Асаблівай увагі чытача заслугоўвае казка-легенда «Наяда марская, або Услед за песняй». Гэта надзвычай кранальная гісторыя пра тое, як жыхарка мора Нерэіда настолькі моцна ўпадабала спеў Салаўя, які на шляху ў вырай прыпыніўся ля вусця ракі, што вырашыла выправіцца ў доўгае і небяспечнае падарожжа на радзіму спевака. Як вядома, Нерэіды жывуць толькі ў салёнай і цёплай марской вадзе, таму доўга плыць па халоднай і прэснай рацэ гераіні было надзвычай складана. Крыху дапамагаў вянок з салёных водарасцяў, які сёстры ёй падарылі на развітанне, але вандроўка была такой доўгай і складанай, што лісткоў не хапіла да часу вяртання Салаўя пасля зімоўкі на Поўдні... Не, яна не загінула, але ператварылася... у Наяду, жыхарку ракі. Дачакалася вясны і новай чароўнай песні, але, насуперак наказам сясцёр, пусціла карані ў далёкай і халоднай рацэ, таму ўжо ніколі не змагла вярнуцца ў родную марскую ваду, цёплую і салёную.

Пад вадой азёраў і рэк хаваецца шмат таямніц. Тут жывуць незвычайныя істоты, адбываюцца чароўныя падзеі, часам нават вадзянікі катаюцца на атракцыёнах. Фантазія пісьменніцы Наталлі Бучынскай дазваляе нам зазірнуць у гэты чароўны свет. Вядома, аўтарка не ўздымае ўсіх сакрэтаў з глыбіні, ды ці патрэбна гэта? Магчыма, нехта бачыць краіну Падводдзе зусім іншай, і ў любым выпадку — ніхто з нас не памыляецца.

**Марына ВЕСЯЛУХА**




# КРЫЖАВАНКА-ПЕРАКЛАД



**Перакладзіце з рускай мовы на беларускую наступныя словы:**

**ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: 5**. Холст (тонкий). **6**. Точка. **9**. Невиданный. **10**. Корка. **11**. Понёва. **13**. Полка (в ружье). **14**. Подойник. **19**. Грусть, кручина. **21**. Ядовитый. **22**. Блаженство. **23**. Кувшинчик. **24**. Ноябрь. **25**. Ярмарка. **26**. Забота, печаль.

**ПА ВЕРТЫКАЛІ: 1**. Клюква. **2**. Клён (единичное дерево). **3**. Пример. **4**. Кипрей, иван-чай. **7**. Ужин. **8**. Качество. **11**. Водка, настоянная на кореньях. **12**. Чесотка. **15**. Картофель. **16**. Избранник. **17**. Качели. **18**. Маленькое куриное яичко. **20**. Головня. **21**. Отпечаток.

**Склала Таццяна КУЗЬМІЧ**, *г. Віцебск.*

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ.**

**ПА ГАРЫЗАНТАЛІ:** 5. Кужаль. 6. Кропка. 9. Нябачаны. 10. Скарынка. 11. Андарак. 13. Брантка. 14. Дайніца. 19. Журбота. 21. Атрутны. 22. Асалода. 23. Званочак. 24. Лістапад. 25. Кірмаш. 26. Дакука. **ПА ВЕРТЫКАЛІ:** 1. Журавіны. 2. Клініна. 3. Прыклад. 4. Скрыпень. 7. Вячэра. 8. Якасць. 11. Акавіта. 12. Кароста. 15. Бульба. 16. Абраннік. 17. Гушкалка. 18. Зносак. 20. Асмалак. 21. Адбітак.

Даты | Падзеі | Людзі

## 7 КАСТРЫЧНІКА

**1788** год — нарадзіўся (вёска Гразівец, цяпер Чавускі раён) Іван Іванавіч Насовіч, беларускі мовазнавец-лексікограф, фалькларыст, этнограф. У 1813-1843 гадах працаваў у Аршанскім, Мсціслаўскім духоўных вучылішчах, Дынабургскай гімназіі, Маладзечанскім, Свянцянскім дваранскім вучылішчах. З 1843 года жыў у Мсціславе, займаўся навуковай дзейнасцю. Супрацоўнічаў з Аддзяленнем рускай мовы і славеснасці Пецярбургскай акадэміі навук, Археаграфічнай камісіяй, Аддзяленнем этнаграфіі Рускага геаграфічнага таварыства. Шмат падарожнічаў па Беларусі, сабраў багаты лексічны, фразеалагічныя і фальклорна-этнаграфічны матэрыял. Аўтар першага гістарычнага слоўніка беларускай мовы «Алфавітны паказальнік старажытных беларускіх слоў, вынятых з «Актаў, якія адносяцца да гісторыі Заходняй Расіі», у якім растлумачана каля 13 тысяч слоў і паняццяў. Асаблівае месца ў навуковай дзейнасці Насовіча займае «Словарь белорусского наречия». У ім больш за 30 тысяч слоў, запісаных аўтарам у Магілёўскай, Мінскай і Гродзенскай губернях, а таксама запазычаных з фальклорных твораў і літаратурных помнікаў старажытнай беларускай пісьменнасці, раскрыты значэнні слоў і словазлучэнняў, дадзена іх этымалогія, прыведзены прыкладныя рускія эквіваленты. Складальнік фальклорна-этнаграфічных зборнікаў «Беларускія прыказкі і прымаўкі», «Зборнік беларускіх прыказак», «Беларускія прыказкі і загадкі», «Беларускія песні» і інш. Аўтар гісторыка-лінгвістычнага даследавання «Аб плямёнах з часоў Рурыка, якія засялялі беларускую тэрыторыю», артыкулаў, прысвечаных песеннай культуры беларусаў. Яго фальклорныя запісы ўвайшлі ў тамы серыі «Беларуская народная творчасць». Памёр у 1877 годзе.



**1936** год — нарадзіўся (вёска Скураты Івацэвіцкага раёна) Тамаш Фаміч Мажэйка, беларускі хімік, член-карэспандэнт НАН Беларусі (1991), доктар хімічных навук (1989). Аўтар навуковых прац па калоіднай хіміі і фізіка-хімічнай механіцы. Распрацаваў навуковыя асновы рэгулявання калоідна-хімічных уласцівасцей глініста-солевых дысперсій, якія ўтвараюцца пры вытворчасці калійных угнаенняў. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1990).

**1977** год — прынята апошняя, «брэжнеўская», Канстытуцыя СССР. Яна істотна не змяніла дзяржаўнага ладу — разам з КПСС, ВЛКСМ, ВЦСПС, КСЖ, творчымі саюзамі, легальнымі грамадскімі арганізацыямі былі прызнаны працоўныя калектывы з прадастаўленнем ім фармальнага права вылучэння кандыдатаў (пры гэтым больш поўна дзейнасць працоўных калектываў была апісана ў законе «Аб працоўных калектывах і павышэнні іх ролі ў кіраванні прадпрыемствамі, установамі, арганізацыямі», прынятым у 1983 годзе). З менш значных змяненняў — перайменаванне Саветаў дэпутатаў працоўных у Саветы народных дэпутатаў і павелічэнне тэрміну паўнамоцтваў Вярхоўнага Савета да 5 гадоў, Саветаў народных дэпутатаў да 2,5 года. Гэтая канстытуцыя замацоўвала аднапартыйную палітычную сістэму (артыкул 6). Увайшла ў гісторыю як «канстытуцыя развітага сацыялізму».

**Было сказана**

**Артур ВОЛЬСКІ, пісьменнік:**
*«Кожны добры позірк — набыццё, а кожны злосны позірк — гэта страта».*

**Крынічка**

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

**Перац добра прыстасаваны для вырошчвання ў хатніх умовах. Ён адносіцца да шматгадовых раслін і можа пражыць пры спрыяльных умовах два ці тры сезоны.**

## ПЕРЦЫ БУДУЦЬ РАСЦІ І НА ПАДАКОННІКУ

**Завяршаюцца агародныя справы на садовым участку. Дні становяцца халаднейшымі, па начах пачынае падмарожваць, і многія цеплалюбівыя расліны завяршаюць вегетацыю і гінуць. Але некаторыя з іх можна выратаваць, даць ім магчымасць развівацца дома.**

Вырошчванне агародніны ў кватэры — справа няпростая. Спачатку трэба падрыхтаваць тару (ёмістасці, кантэйнеры) і глебагрунт.

Кантэйнеры павінны быць пранікальнымі для паветра, забяспечваць сцёк лішкаў вады пасля паліву. Грунту трэба на кожную расліну ад 1 да 8 л.

Для нармальнага развіцця і плоданашэння раслін абмежаваны аб'ём глебы пад кожнай з іх павінен мець дастатковы запас пажыўных элементаў. Гэта дасягаецца добрай першапачатковай запраўкай грунту арганічнымі і мінеральнымі ўгнаеннямі і наступнымі падкормкамі. Глебавыя сумесі лепш зрабіць самім.

Для агурка, кабачка: садовая, дзярновая зямля — 40—75%; гнаявы перагной — 20-35%; торф нізінны — 20—40%. Для тамата, перца: садовая, дзярновая зямля — 40—70%; гнаявы перагной — 20—30%; нізінны торф да 20% ці кварцавы пясок —10%. Для капусты і салаты: садовая, дзярновая зямля — 40—50%; гнаявы перагной — 40—60%; торф да 20%.

У падрыхтаваныя глебавыя сумесі трэба таксама ўнесці і мінеральныя ўгнаенні.

Першай культурай, якую трэба ратаваць, з'яўляецца перац.

Неабходна ўлічваць біялагічныя асаблівасці перца. Паходзіць ён з краін трапічнага пояса, што тлумачыць яго высокую патрабавальнасць да ўмоў вырошчвання. Ён патрабуе шмат цяпла і святла. Перац на ўсіх этапах развіцця вельмі святлолюбівы. Пры зацяненні ападаюць бутоны і завязі, жоўкне лісце. Таму яго лепш трымаць на сонечным акне. Аптымальная тэмпература росту і развіцця складае 20-28 °С днём і 15-20 °С уначы, глеба павінна мець тэмпературу 20 °С. Неабходна памятаць, што пры тэмпературы 15 °С і ніжэйшай яго рост запавольваецца, а пры тэмпературы 13 °С прыпыняецца. Доўгае знаходжанне ў такіх умовах можа негатыўна адбіцца на развіцці раслін і ўраджаю.



Пладаносныя расліны разам з невялікімі пладамі і завязямі ў цяпліцы выкопваюць з вялікім комам зямлі, дабаўляюць неабходную колькасць грунту і высаджваюць у трох- ці пяцілітровыя кантэйнеры і ёмістасці, якія маюць дрэнажныя адтуліны. Догляд раслін у хатніх умовах заключаецца ў падтрыманні светлавога і тэмпературнага рэжыму, своечасовым паліве і падкормках.

Перцы патрабуюць больш частых палівaў, бо не пераносяць нават кароткачасовага падсушвання глебавага субстрату. У перыяд плоданашэння іх паліваюць праз 3-4 дні. Пры невялікіх аб'ёмах гаршчкоў паліў праводзіцца часцей. Перац адмоўна рэагуе на пераўвільгатненне, што патрабуе паліву невялікімі дозамі, але часта.

Расліны падкормліваюць праз 10-16 дзён. Перыядычна выдаляюць жоўтае лісце, вырадлівыя плады і выразаюць бясплодныя парасткі. У хатніх умовах перац будзе добра расці і пладанасіць да канца лістапада і можна атрымаць спелыя чырвоныя плады.

Такім жа чынам можна выкапаць, перасадзіць і вырошчваць на хатнім агародзе і іншыя культуры.

## ЗАКЛАДВАЕМ ГРАДКІ ВОСЕННЮ

**Рыхтуем такую граду восенню заўсёды на адным і тым жа месцы. Севазварот тут не патрэбен, бо восенню, пасля ўборкі агуркоў, граду разбіраем, усю зямлю выносім на бульбяныя палосы, месца апрацоўваем бардоскай вадкасцю і засыпаем попелам. Толькі пасля гэтага пачынаем рабіць новую граду. Месца павінна быць сонечнае, за ветрам.**

Шырыня градкі 1 метр, даўжыня — 6 метраў. На ёй можна вырошчваць 55-60 каранёў расады таматаў і, высадзіўшы двума радамі, 35-40 кустоў агуркоў.

Заглыблена града павінна быць сантыметраў на 20 (на штык рыдлёўкі). Па перыметры ставім раму вышынёй 30 см з дошак ці бярвення. Унутраныя сценкі абкладваем плёнкай. На дно грады насцілаем 10-сантыметровым пластом выразаныя сцёблы маліны. Гэта вельмі патрэбны пласт, які вясной ізалюе больш шчыльныя верхнія пласты ад замерзлай глебы і дае магчымасць градзе хутчэй разагрэцца.

Потым насыпаем лісце, раслінныя рэшткі, перaслойваем іх пілавіннем і зямлёй. Зверху насыпаем 10-сантыметровы пласт зямлі. Стараемся ўсё добра ўтрамбаваць. Града насыпаецца роўна з бартамі. Паліваем вадой і закрываем некалькімі слаямі плёнкі. Далей абкладваем градку вакол анучамі, змочанымі дзёгцем або карболкай, або пасыпаем хлорнай вапнай. Гэта для таго, каб у ёй не завяліся мышы.

Ранняй вясной, калі ўвесь снег яшчэ не растаў, а ўтварыліся толькі праталіны, разаграваем сваю парніковую градку. Прыбіраем плёнку, добра праліваем гарачай вадой 2-3 разы і накрываем плёнкай на 3 дні. Яркае вясновае сонейка зробіць сваю справу — разагрэе граду, пачнецца перапарванне. Праз тыдзень высаджваем туды памідорную расаду. Паміж радамі памідораў сеем радкі ранняй радыскі або ўтыкаем прарослыя цыбуліны. Спачатку ўкрываем без усялякіх прыстасаванняў спанбондам, а зверху поліэтыленавай плёнкай, потым ставім над градкай дугі, укрываем па іх. Зялёная цыбуля будзе на стале ўжо праз два тыдні.

Яшчэ праз 2 тыдні ласуемся радыскай. Пасля ўборкі цыбулі і радыскі адразу ва ўсе міжраддзі сеем палоскамі кроп. Ён будзе расці слабенькім, таму што да таго часу памідорная расада ўжо выдатна разрастаецца і закрывае святло. Але да стала па невялікім пучочку кропу хопіць, пакуль ён вырасце на адкрытым агародзе.

Пасля перасадкі таматаў на пастаяннае месца, калі градка цалкам вызваляецца, перакопваем у ёй зямлю з унясеннем угнаенняў і высаджваем расаду агуркоў. Цяпер гэта на ўсё лета агурочная градка.



## ЦІ ПАТРЭБНА ПЕРАКОПКА?

**Капаць ці не капаць? Вось у чым пытанне. Некаторыя агароднікі перакопваюць усю глебу на ўчастку як мінімум 2 разы за сезон — увесну перад пасадкай і восенню пасля ўборкі ўраджаю.**

Давайце разбяромся ў мэтазгоднасці восеньскай перакопкі. Робяць яе для лепшага прамярзання верхніх слаёў глебы, каб паменшыць колькасць шкоднікаў (многія з іх адкладваюць у глебу для зімоўкі свае лічынкі). Акрамя таго, восеньская перакопка з пераварочваннем пласта без разбівання яго дазваляе заглыбіць насенне пустазелля так, што ўвесну яно не прарастае. Гэта, вядома, аргументы на карысць восеньскай перакопкі. Але ёсць і мінусы.

Глеба — гэта складаны арганізм. Яна ствараецца масай фактараў: мінеральная аснова — пясок, гліна, вапняк і інш., вільготнасць (глыбіня залягання грунтавых вод), колькасць мінеральных соляў і арганічных кампанентаў. Але самае галоўнае — глеба фарміруецца за кошт дзейнасці мікраарганізмаў. Гэта карысныя глебавыя бактэрыі, якія прыстасоўваюцца да пэўных умоў пражывання і гінуць, калі гэтыя ўмовы разбураюцца. Так, пасля восеньскай перакопкі вымярзаюць лічынкі шкоднікаў. Але вымярзаюць і мікраарганізмы.

Акрамя таго, вось што сцвярджае доктар Грэг Хойт — вучоны аграном з Амерыкі: «Чым больш вы трывожыце глебу, тым хутчэй мінералізуецца яе арганічнае рэчыва. Пры апрацоўцы глебы аэрацыя стымулюе актыўнасць глебавых мікраарганізмаў, арганіка паскорана перапрацоўваецца і губляецца, асабліва хутка і непрадуктыўна губляецца азот».

Выснова тут напрошваецца сама: не турбуйце глебу дарма.

# СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.22 | 18.32 | 11.10 |
| Віцебск — | 7.12 | 18.21 | 11.09 |
| Магілёў — | 7.12 | 18.22 | 11.10 |
| Гомель — | 7.07 | 18.20 | 11.13 |
| Гродна — | 7.37 | 18.48 | 11.11 |
| Брэст — | 7.36 | 18.50 | 11.14 |

## Месяц

***Апошняя квадра 4 кастрычніка. Месяц у сузор'і Льва.***

## Імяніны

***Пр.** Андрэя, Васіля, Віталя, Паўла, Сяргея, Уладзіслава.*
***К.** Марыі, Марка, Сцяпана, Сяргея.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Чым менш жанчыну мы кахаем, тым горшы боршч, кашулі непрасаваныя, шкарпэткі нямытыя і дзеці на цябе не вельмі падобныя...**

— Бог ежы і ўрадлівасці ў народаў Крайняй Поўначы, 8 літар?
— Верталёт.

**— Сёння моладзь адчувае ўсё больш страх перад шлюбам.**
**— І правільна робіць! Я да шлюбу наогул не ведаў, што такое страх.**



caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.646. Індэкс 63850. Зак. № 4033.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 6 кастрычніка 2015 года.